Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№121 (28485)

28 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12



**Жыццё без бар'ераў**

МС



**Як вырабляюць 60 тон марожанага ў суткі**

СТАР. 4



**Сакрэты стабільнага шлюбу**

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**Больш за 150 тыс.**

*замежных грамадзян атрымалі медпаслугі летась у арганізацыях сістэмы Міністэрства аховы здароўя Беларусі. У 2016 годзе экспартавана медыцынскіх паслуг праз усе каналы рэалізацыі на $35,2 млн (у 2015 годзе — на $33,5 млн). Тэмп росту экспарту медпаслуг у студзені—сакавіку 2017 года склаў 106 працэнтаў ($8,4 млн), больш як у 2 разы павялічаны экспарт у Літву, Грузію, Польшчу. Дарэчы, па колькасці трансплантацый органаў на 1 млн насельніцтва Беларусь з'яўляецца лідарам на постсавецкай прасторы і апярэджвае многія еўрапейскія краіны. У Беларусі выконваецца 50 трансплантацый на 1 млн насельніцтва (у сярэднім па Еўропе — 55,9, у Расіі — 10,1, Украіне — 3,2). Даступнасць аперацый на адкрытым сэрцы ў краіне склала 360 на 1 млн насельніцтва.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9249 | ▲ |
| Еўра | 2,1539 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0738 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# АКНО Ў АЗІЮ

## Мінск прымае Прэзідэнта В'етнама

**Сёлета спаўняецца 25 гадоў наладжванню дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і В'етнамам. Супрацоўніцтва з гэтай азіяцкай краінай выглядае перспектыўным і для прыватнага бізнесу, і для дзяржаўных прадпрыемстваў. Мэта на найбліжэйшы час — дасягнуць тавараабарот у $500 млн. Пра тое, як развіваць супрацоўніцтва, ішла размова падчас афіцыйных перагавораў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам В'етнама Чан Дай Куангам у Палацы Незалежнасці ў Мінску.**

Падчас перагавораў Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь і В'етнам аб'ядноўвае гісторыя доўгіх адносін. Беларускі народ быў побач і ў цяжкі перыяд в'етнамскай гісторыі: падчас вайны. А пасля дапамагаў аднаўляць краіну. Кіраўнік беларускай дзяржавы запэўніў, што курс на працяг добрых адносін застаецца нязменным. Гэта датычыцца як палітыкі, так і гандлю.

Беларусь гатова не толькі пастаўляць айчынную прадукцыю, але і закупляць в'етнамскую. Нас цікавяць пастаўкі морапрадуктаў, рысу, чаю, кавы, садавіны, каўчуку... Для развіцця гандлёва-эканамічных сувязяў магчыма пашыраць пастаўкі беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі, кандытарскіх вырабаў, машынакамплектаў. Праз В'етнам адкрываецца рынак краін-удзельніц Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі. Але зараз аснову нашага супрацоўніцтва складае прамкааперацыя.

Прэзідэнт Беларусі запэўніў, што кампаніі В'етнама могуць удзельнічаць у рэалізацыі праектаў у Беларусі, у тым ліку ў галінах сельскай гаспадаркі, прамысловасці і турызму. Зона свабоднага гандлю паміж В'етнамам і Еўразійскім эканамічным саюзам дае магчымасць для развіцця больш цеснай кааперацыі. Дарэчы, у В'етнаме да канца гэтага года плануюць стварыць сумесную вытворчасць грузавой тэхнікі МАЗ, а ў перспектыве — новую вытворчасць гарадскіх пасажырскіх аўтобусаў.



Фота БЕЛТА.

СТАР. 2

# Шчаслівыя разам



У невялікай вёсцы Убель, што на Чэрвеньшчыне, пад вечар, пасля клопатнага летняга дзянька, можна сустрэць гэтых жанчын. Яны часта сядзяць на лаўцы пад маладой слівай, туляцца адна да адной, вядуць нетаропкія размовы. Усміхаюцца, а часам і сумуюць — у жыцці не без гэтага. Галіна Уладзіміраўна Корзун, Мая Уладзіміраўна Таболіна, Ніна Уладзіміраўна Простак і Тамара Уладзіміраўна Клімовіч — родныя сёстры. Жыхаркі сталіцы, пенсіянеркі, з вясны да восені становяцца заўзятымі вяскоўкамі: сеюць і полюць грады, збіраюць ураджай садавіны і агародніны, ходзяць у лес па грыбы і ягады. Галіна і Мая — старэйшыя (на фота сёстры сядзяць у цэнтры), нарадзіліся незадоўга да вайны. А Ніна і Тамара з'явіліся адразу пасля ваеннага ліхалецця. Але ўзроставая розніца жанчынам не замінае — яны яе не адчуваюць. Вядома, у кожнай — свой, непаўторны лёс, свая сям'я, дзеці, унукі. А яны па-ранейшаму цягнуцца адна да адной, клапоцяцца адна пра адну, выручаюць у розных абставінах. Сёстры наўмысна пабудавалі свае лецішчы недалёка ад бацькоўскай хаты, каб быць побач. І ніколі пра гэта не пашкадавалі.

— Нас грэе наша малая радзіма, а тое, што мы заўсёды разам, робіць нас шчаслівейшымі, — кажуць сёстры.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Занятасць

# ТРАКТАРЫСТЫ, МАТРОСЫ, ДАРОЖНІКІ

## Дзе летам патрэбны працоўныя рукі

**Дзяржаўныя службы занятасці адзначаюць: летам сітуацыя з працаўладкаваннем традыцыйна паляпшаецца. У прыватнасці, з-за росту вакансій на часовых і сезонных работах. «Звязда» даведалася, дзе патрэбны кадры на цёплы перыяд.**

За апошні месяц у Агульнарэспубліканскім банку вакансій з'явілася каля паўтысячы прапаноў сезонных работ. Больш за ўсё месцаў для прадаўцоў — 59. У Мазыры шукаюць пяць прадаўцоў квасу, у Магілёве і Старых Дарогах патрэбны людзі для гандлю агароднінай і садавінай на рынках. Неабходны прадаўцы ў летнія кавярні ў Рагачове і Калодзішчах. Заробкі — ад 265 да 600 рублёў, у залежнасці ад выручкі.

Патрэбу ў кадрах на лета мае сельская гаспадарка. Калгасы гатовы прыняць на працу 33 жывёлаводы. Заработная плата — у сярэднім 400 рублёў. Кандыдатам пажадана мець чацвёрты-пяты тарыфны разрад. Адкрыта 26 вакансій для агароднікаў. Ёсць прапановы з жыллём — на сельгаспрадпрыемстве ў вёсцы Залессе Кобрынскага раёна. На перыяд уборкі збожжавых шукаюць трактарыстаў (42 прапановы). У некаторых гаспадарках абяцаюць у месяц ад тысячы рублёў.

Нарыхтоўшчыкаў прадуктаў і сыравіны запрашаюць на працу райспажыўтаварыствы. Заробкі, праўда, невысокія — у памеры «мінімалкі». Ёсць работа для страхароў. З патрабаванняў — прафесійна-тэхнічная адукацыя і адсутнасць шкодных звычак.

У сталіцы патрэбны чатыры касіры атракцыёнаў. Веданне касавых апаратаў і вопыт работы — абавязковы. Праца па зменным графіку. У месяц абяцаюць 425 рублёў.

**Важна**

**Калі беспрацоўны ўладкоўваецца на сезонную работу, ён аўтаматычна здымаецца з уліку і губляе права атрымліваць дапамогу па беспрацоўі. Зарэгістравацца зноў можна будзе, як толькі скончыцца дагавор з наймальнікам.**

Ёсць і вакансіі, дзе не патрабуецца спецыяльнай адукацыі. Так, адкрыта 40 месцаў для падсобных рабочых. Сярод абавязкаў — праца на збожжатоку, абслугоўваць меліярацыйную сетку. У Маладзечне, Барысаве і Полацку набіраюць рабочых зялёнага будаўніцтва — у асноўным для пакосу травы. Мужчыны без адукацыі могуць таксама ўладкавацца дарожнымі рабочымі, такіх вакансій па краіне 19.

Традыцыйна набіраюць персанал дзіцячыя лагеры і санаторыі. Напрыклад, у санаторый «Жамчужына» (Лепельскі раён) на «мінімалку» шукаюць афіцыянта на перыяд работы па жніўень уключна. У аздараўленчыя лагеры «Лясная казка» (Вілейскі раён) і «Салют» (Кобрынскі раён) патрэбны мыйшчыкі посуду. Вакансія грузчыка адкрыта ў летніку «Купалінка» (Радашковічы), пакаёўкі — на турбазе «Лясное возера» (за 35 кіламетраў ад Баранавіч). А ў санаторый «Шыннік» да канца верасня неабходны два матросы-ратавальнікі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# АКНО Ў АЗІЮ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Імпульс для далейшага развіцця эканомікі дае і супрацоўніцтва кампаній, напрыклад, БелАЗа, вытворцы кар'ернай тэхнікі, і Vinacomin, в'етнамскай горназдабыўнай кампаніі. Існуе пэўная зацікаўленасць для сумесных інфраструктурных праектаў. Так, у В'етнаме працуе прадстаўніцтва «Мінскметрапраекта», гатовае выканаць заказы рознай цяжкасці, таму Аляксандр Лукашэнка прапанаваў спраектаваць станцыі метро «Мінская» ў Ханоі і «Беларуская» ў Хашыміне.

Пасля перагавораў быў падпісаны шэраг дакументаў, у тым ліку сумесная заява прэзідэнтаў, накіраваная на ўмацаванне ўзаемавыгаднага партнёрства. Важна, што Брэсцкая вобласць разам з в'етнамскай правінцыяй Лаакай падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве. «Гэта доказ самых сур'ёзных намераў у гэтым напрамку», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. Вопыт развіцця міжрэгіянальных адносін з іншымі краінамі паказвае добры вынік як у гуманітарнай, так і ў гандлёва-эканамічнай сферы. «Яшчэ больш зблізіць нашы народы здольна супрацоўніцтва ў такіх галінах, як адукацыя, навука, спорт, культура», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт В'етнама Чан Дай Куанг дадаў, што пашыраць супрацоўніцтва з Беларуссю магчыма не толькі ў эканоміцы, але і ў сферы абароны і бяспекі. В'етнам падзяляе погляды Беларусі па многіх пытаннях на міжнародных форумах, запэўніў ён. Агульныя намаганні дадуць імпульс для развіцця абедзвюх краін, не сумняваецца в'етнамскі лідар.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

## НАПЕРАДЗЕ — ВЯЛІКАЯ ПРАЦА

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА правёў рабочую сустрэчу з Прэзідэнтам В'етнама ЧАН Дай Куангам.**

— Мы разглядаем Сацыялістычную Рэспубліку В'етнам як надзейнага і стратэгічна важнага партнёра для Рэспублікі Беларусь, — адзначыў у прывітальным слове Уладзімір Андрэйчанка.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў дадаў, што ў парламентах дзвюх краін функцыянуюць працоўныя групы дружбы, а таксама падпісаны шэраг дакументаў аб супрацоўніцтве — усяго дагаворна-прававая база складае 65 пагадненняў.

— Гэта значыць існуючы неабходныя асновы для ўмацавання нашага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Таксама парламент Беларусі аператыўна ў мінулым годзе ратыфікаваў пагадненне аб зоне свабоднага гандлю паміж ЕАЭС і В'етнамам. Я думаю, усё гэта дало магчымасць нарасціць узаемны тавараабарот, ён у нас вырас за чатыры месяцы — каля 30%, — дадаў спікер.

На яго думку, для росту паказчыкаў неабходна вялікая праца.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

# УМОВЫ СТВОРАНЫ, СЛОВА ЗА БІЗНЕСАМ

**Космас, сельская гаспадарка, інфармацыйныя і біятэхналогіі, хімічная прамысловасць, ахова здароўя, харчаванне... В'етнамскія госці з цікавасцю разглядаюць стэнды выстаўкі, на якой прадстаўлены беларускія дасягненні, што падрыхтавалі Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях. Бізнесмены разбіваюцца на групы і падыходзяць да тых стэндаў, якія непасрэдна звязаны з іх сферай. Затым — абмен кантактамі і спадзеў, што гэта не апошняя сустрэча...**

— Бізнес павінен гутарыць, а палітыкі павінны ствараць для гэтага спрыяльныя ўмовы. Тым больш калі гаворка ідзе пра настолькі сяброўскія адна адной дзяржавы, як Беларусь і В'етнам, — сказаў падчас адкрыцця беларуска-в'етнамскага бізнес-форуму Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік беларускай дзяржавы акрэсліў шэсць найбольш перспектыўных для супрацоўніцтва сфер для дзвюх краін: прамысловасць, інфраструктура і будаўніцтва, засваенне і выкарыстанне прыродных рэсурсаў, лёгкая прамысловасць, інфармацыйна-камунікацыйныя і высокія тэхналогіі, турызм.

Шэраг беларускіх навукаёмістых і высокатэхналагічных прадпрыемстваў разглядае магчымасць лакалізацыі ў індустрыяльных парках В'етнама.

— Мы ўсур'ёз разглядаем В'етнам як «плацдарм» для нашага замацавання ў Паўднёва-Усходняй Азіі і сумеснага выхаду са стваранай прадукцыяй і паслугамі ў краіны АСЕАН. Падпісанне першага, флагманскага пагаднення аб зоне свабоднага гандлю паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і В'етнамам адкрывае прынцыпова новыя перспектывы развіцця гандлёва-эканамічных адносін, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Для таго каб сумесная работа адбывалася штодзённа, кіраўнік беларускай дзяржавы прапанаваў стварыць сумесны Дзелавы савет. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка дадаў, што план па павелічэнні тавараабароту будзе распрацаваны, але ператвараць яго ў рэчаіснасць належыць самім бізнесменам.

**❍ У ТЭМУ**

**Уладзімір УЛАХОВІЧ, старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты:**

— Устаноўка давесці наш тавараабарот да паўмільярда долараў — даволі рэальная задача. Традыцыйна мы супрацоўнічаем у машынабудаўнічай сферы, харчовай, фармацэўтычнай. Калі ўлічыць, што В'етнам робіць стаўку на інавацыйнае развіццё эканомікі, то ўвагу яго прадстаўнікоў прыцягнуць праекты, якія прадстаўлены на сённяшняй выстаўцы.

**ЛІ Уанг Хуан, кіраўнік в'етнамскай сельскагаспадарчай кампаніі «Тры зялёныя лісты»:**

— Мы займаемся ўгнаеннямі ўжо больш за 20 гадоў. Таму нездарма спыніліся побач са стэндамі, прысвечанымі беларускай сельскагаспадарчай тэхніцы і арганізацыі цяплічнай гаспадаркі. Ваша прадукцыя нам цікавая як сваёй якасцю, так і коштам. Ужо абмяняліся кантактамі і плануем развіваць супрацоўніцтва з Беларуссю.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Чарговага прэзідэнта Бразіліі абвінавацілі ў хабарніцтве

Генеральны пракурор упершыню ў гісторыі краіны папрасіў Вярхоўны суд выставіць абвінавачанні дзейнаму прэзідэнту краіны: Мішэла Тэмера, як сцвярджаецца, злавілі на хабары, передае BBC.

Тэмера абвінавацілі ў атрыманні грошай ад мяснога кампаніі JBS, якая трапіла ў карупцыйны скандал. Калі суддзя Вярхоўнага суда вырашыць пайсці супраць прэзідэнта, ён мусіць перадаць справу ў ніжнюю палату парламента, якая павінна даць дазвол на суд. Тэмеру могуць выставіць і некалькі абвінавачанняў па асобных эпізодах, тады парламент будзе галасаваць за дазвол па кожным асобна.

Сам прэзідэнт Тэмер абвяргае любыя абвінавачанні. Ён перакананы, што яго і ягоных міністраў «нішто не знішчыць».

Раней прэзідэнта, які летась заступіў на пасаду, ужо абвінавачвалі ў карупцыі ў вуснай форме, але цяпер агучана першае фармальнае абвінавачанне. Гэта адбылося пасля публікацыі аўдыязапісу, на якім Тэмер нібыта абмяркоўвае хабар з дырэктарам JBS. Называецца сума хабару ў 152 тысячы долараў, а таксама нібыта абяцанне даць Тэмеру яшчэ 11 млн долараў.

Рэйтынг падтрымкі Тэмера, як перадае New York Times, апусціўся да 7% яшчэ да публікацыі запісу. Гэта нават ніжэй, чым мела Дзілма Русеф — папярэдні прэзідэнт Бразіліі, якая летась была адхілена праз імпічмент. Такі нізкі рэйтынг прэзідэнта рэкордны для Бразіліі за апошнія 30 гадоў.

### Еўракамісія аштрафавала Google на €2,4 млрд

Рашэнне было прынята за парушэнне антыманапольных правілаў Еўрасаюза. Пра гэта гаворыцца ў заяве ЕК, распаўсюджанай у аўторак у Брусэлі.




«Кампанія злоўжывае сваім дамінуючым становішчам на рынку ў якасці пошукавай сістэмы, даючы незаконную перавагу іншаму прадукту Google», — адзначаецца ў дакуменце.

У Google заявілі, што кампанія можа падаць апеляцыю ў Еўрапейскі суд на рашэнне ЕК. «Мы выказваем паважлівую нязгоду з высновамі, апублікаванымі сёння, — гаворыцца ў заяве, апублікаванай у афіцыйным блогу карпарацыі ў аўторак. — Мы дэталёва вывучым рашэнне камісіі, мы разглядаем магчымасць падачы апеляцыі».

### Трамп дапусціў магчымасць умяшання РФ і іншых краін у выбары прэзідэнта ЗША

У той жа час Белы дом заявіў аб адсутнасці прыкмет змовы паміж Расіяй і перадвыбарным штабам Дональда Трампа на леташніх выбарах. Такую пазіцыю выказаў прэс-сакратар кіраўніка амерыканскай дзяржавы Шон Спайсер на брыфінгу для журналістаў.

Паводле яго слоў, новыя даныя аб тым, што адміністрацыя экс-прэзідэнта Барака Абамы ведала пра ролю Расіі перад выбарамі, «пацвярджаюць, што ніякай змовы не было». Што датычыцца меркавання Трампа пра ролю Расіі, то Спайсер сказаў: «Наш прэзідэнт працягвае прытрымлівацца пазіцыі, якую ён займаў у студзені». Іншымі словамі, ён лічыць, што ўмешвацца маглі «як Расія, так і якая-небудзь іншая краіна», растлумачыў прэс-сакратар.

ФБР ЗША вядзе расследаванне з нагоды сцвярджанняў аб нібыта наяўных спробах расійскага ўрада паўплываць на прэзідэнцкія выбары 2016 года, а таксама звязаных з гэтым пытанняў. Паралельна разборы на гэтую тэму праводзяцца спецкамітэтам па разведцы Сената і Палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША.

■ Меркаванне



# ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ ДЫПЛАМАТЫЧНЫМ АДНОСІНАМ З РАСІЯЙ

**25 чэрвеня 2017 года споўнілася дваццаць пяць гадоў з дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь. Гэтай даце была прысвечана сумесная заява міністраў замежных спраў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь. У ёй ацэньваецца гісторыя супрацоўніцтва дзвюх усходнеславянскіх краін і разглядаецца шырокі спектр сумесных падыходаў да найважнейшай міжнароднай праблематыкі.**

Беларуска-расійскія адносіны расцэньваюцца як адносіны стратэгічнага саюзніцтва, якія адпавядаюць чаканням народаў нашых краін. І гэта сапраўды так. Гатоўнасць да збліжэння і цеснага супрацоўніцтва стала першараднай у рэалізацыі мноства пагадненняў, якія скарацілі дыстанцыю паміж двума братэрскімі народамі да ўзроўню, які больш звыклы ў параўнанні з сітуацыяй канца 1991 года, калі беларусы і расіяне аказаліся па розныя бакі новай граніцы. На гэты момант граніца мае больш сімвалічны характар, чым рэальны, што адпавядае чаканням беларусаў, сярод якіх да 80 працэнтаў маюць сваякоў на расійскай тэрыторыі.

Асаблівы акцэнт у заяве зроблены на рэгіянальную спецыфіку. Як адзначаецца, «усё больш значным складнікам расійска-беларускіх сувязяў становіцца ўзаемадзеянне паміж суб'ектамі Расійскай Федэрацыі і адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі ўтварэннямі Рэспублікі Беларусь. Наглядным сведчаннем агульнай зацікаўленасці ў нарошчванні такіх кантактаў з'яўляецца рэгулярнае правядзенне Форумаў рэгіёнаў Беларусі і Расіі». Сапраўды, і па гэтым аспекце лідарства, несумненна, належыць беларускаму боку. Менавіта беларускі Прэзідэнт з 1994 года зрабіў адной з самых галоўных сваіх задач паездкі па рэгіёнах Расіі, тым самым дапамагаючы беларускім прадпрыемствам захаваць рынкі збыту і размяшчаючы заказы на расійскіх прадпрыемствах, якія пастаўляюць камплектуючыя ў Беларусь. Расія толькі ў апошнія гады робіць акцэнт на індустрыялізацыі эканомікі і шкадуе пра страчаныя ў 1990-х гадах прамысловыя прадпрыемствы. Але калі б гэтых паездак у 1990-я не было, а інтэграцыя Беларусі і Расіі не адбылася, шкадаваць давялося б пра значна большы аб'ём страчанага прамысловага патэнцыялу.

Значнае месца ў заяве нададзена рэалізацыі ініцыятывы «інтэграцыі інтэграцый». Менавіта ў ёй кіраўніцтву абедзвюх дзяржаў бачыцца эканамічная перспектыва пераадолення штучных бар'ераў і жалезных заслон, якія падзяляюць дзве часткі Еўропы. На жаль, падзеі на ўкраінскай тэрыторыі істотна знізілі магчымасці абмяркоўваць і дамаўляцца аб стварэнні ў будучыні адзінай эканомікі ад французскага Брэста да расійскага Уладзівастока. Але і Масква, і Мінск не страчваюць надзею на тое, што аднойчы ўсё ж атрымаецца прыйсці да рэалізацыі лагічнай мэты — звязаць у адной эканамічнай прасторы тэхналогіі ЕС і рэсурсы ЕАЭС, што надасць абодвум бакам новыя магчымасці для развіцця.

Як адзначаецца ў заяве, «нашы краіны арыентаваны на ўмацаванне цэнтральнай каардынуючай ролі ААН у забеспячэнні міру, бяспекі і ўстойлівага развіцця, далейшае павышэнне эфектыўнасці яе дзейнасці». Сапраўды, адной з сучасных праблем ва ўрэгуляванні канфліктаў на сусветнай сцэне з'яўляецца відавочная супярэчнасць паміж дэкларавайнай цэнтральнай роляй ААН і міжнародная права і аднабаковымі дзеяннямі асобных магутных краін, якія адкрыта грэбуюць і тым, і іншым. Аднабаковыя санкцыі ў абыход інструментаў ААН з'яўляюцца адным з найбольш непрыемных момантаў і для Беларусі, і для Расіі, наносячы шкоду нашым эканомікам.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца ў заяве імкненню да вырашэння ўсяго комплексу задач саюзнай інтэграцыі і двухбаковага ўзаемадзеяння ў мэтах садзейнічання ўстойліваму развіццю абедзвюх дзяржаў і росту іх аўтарытэту на міжнароднай арэне. Сапраўды, тое, што стала інтэграцыйным трэндам у пачатку XXI стагоддзя на прасторах былога СССР, упершыню на практыцы пачало фарміравацца ў сярэдзіне 1990-х паміж Расіяй і Беларуссю. У той час, калі ніхто не задумваўся аб практычных кроках па цесным збліжэнні Расіі і Казахстана, Расіі і Арменіі, Расіі і Кыргызстана, Масква і Мінск пачалі крок за крокам набліжацца адно да аднаго, прымаць усё новыя найважнейшыя дакументы, якія вырашаюць практычныя інтэграцыйныя задачы паміж дзвюма краінамі. Калі палітыкі дзвюх краін кажуць, што пры стварэнні ЕАЭС вялікая ўвага ўдзялялася вопыту стварэння і функцыянавання Саюзнай дзяржавы, тым самым яны падкрэсліваюць важнасць шляху, пачатага ў 1996 годзе з моманту станаўлення Саюзнай дзяржавы.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■ Прафсаюзы

# ЗАДАЦЬ ТЭМП

## Моладзь з 15 краін абмяркуе будучыню сферы працы

**Учора ў сталіцы адкрыўся Міжнародны маладзёжны прафсаюзны адукацыйны форум «ТЭМП-2017». Сёлета ён сабраў больш за 200 актывістаў з 15 краін: Казахстана, Кіпра, Літвы, Малдовы, Расіі, Турцыі і іншых. Упершыню далучылася моладзь з Індыі, Ізраіля і Эстоніі.**

— Форум праходзіць трэці раз. У гэтым годзе ён прысвечаны будучыні сферы працы. Пачуем, што робяць прафсаюзы для работнікаў у нашай краіне, у іншых, падзелімся досведам. Прыемна, калі бачым, як нашы інавацыі рэалізуюцца на практыцы за мяжой, — расказвае **начальнік галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай рабоце Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Глеб ЛАПІЦКІ.**

«Тэмпаўцы» наведаюць беларускія прадпрыемствы прамысловай, сельскагаспадарчай, банкаўскай сферы. Сярод іх — Мінскі трактарны завод, «Атлант», «Камунарка», Мінскі завод колавых цягачоў, гаспадарка «Гастэлаўскае». Прафсаюзныя актывісты вывучаць вопыт сацыяльнага партнёрства і калектыўных дагавораў, абмяркуюць механізмы стварэння новых працоўных месцаў, новыя формы занятасці насельніцтва.

— Мы бачым, што свет змяняецца вельмі хутка. Ва ўсіх галінах ідзе аўтаматызацыя, рабатызацыя. У выніку неактуальнымі становяцца цэлыя прафесіі, не толькі фізічнай, але і разумовай працы. Таму важна зразумець, як будзе трансфармавацца рынак, каб у новых умовах моладзь магла знайсці сабе работу, — адзначыў **старшыня ФПБ Міхаіл ОРДА.**

Ён дадаў, што форум першапачаткова задумваўся як адукацыйная пляцоўка, але цяпер ужо відаць, што ён мае значна больш патэнцыял. Гэта новы ўзровень узаемадзеяння прафсаюзаў розных краін. Фінальным дакументам сёлетняга «ТЭМПу» стане рэзалюцыя ўсіх дзяржаў-удзельніц з канкрэтнымі прапановамі, якая будзе адпраўлена ў Міжнародную арганізацыю працы.

Моладзь чакае насычаная культурная праграма. Так, 29 чэрвеня яна прыме ўдзел у маштабным праекце ФПБ — урачыстым адкрыцці выстаўкі «Пераможнае лета» на мемарыяльным комплексе «Курган славы». Тут будуць устаноўлены інфармацыйныя стэнды аб наступальнай аперацыі «Баграціён» і военачальніках, якія падчас Вялікай Айчыннай вайны кіравалі гэтай аперацыяй. Удзельнікі форуму таксама змогуць ацаніць пастаноўку «Сем таямніц Беларусі» — праект Рэспубліканскага Палаца культуры прафсаюзаў і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. І прыгатаваць дранік на маладзёжным фестывалі вулічнай ежы Dranik Party. А 1 ліпеня прафсаюзных актывістаў чакае спартыўны квэст.

Нагадаем, «ТЭМП» традыцыйна становіцца найбуйнейшай міжнароднай дыскусійнай пляцоўкай паміж моладдзю, дзяржаўнымі структурамі і бізнесам.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# ХТО СТАНЕ КЛАСІКАМ?

## Нацыянальная літаратурная прэмія: слова за экспертамі

**Наш час будзе мець сваіх класікаў літаратуры. Кагосьці прымаюць і прызнаюць пры жыцці, а некаторыя імёны вылучаюць нашчадкі, калі праходзіць час. Аўтарам патрэбная ўвага — найперш з той прычыны, што пішуць яны для сваіх сучаснікаў і пра іх. Таму Беларусь мае сваю Нацыянальную літаратурную прэмію.**

Апошнія дні падачы заявак і магчымасць трапіць у шорт-ліст Нацыянальнай літаратурнай прэміі ёсць у кожнага, хто мае кнігу... Хто піша сам і лічыць свае творы вартымі высокай адзнакі ці чые работы ацанілі калегі з творчых саюзаў альбо чытачы бібліятэк, ці выдавецтва лічыць нейкую кнігу вялікай удачай... Найлепшых назавуць у Дзень беларускага пісьменства ў Полацку. Але для таго, каб іх вызначыла журы (сустаршынямі якога з'яўляюцца намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч і прафесар, член праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Іван Саверчанка), пакуль у працу ўключыліся эксперты: фарміруецца выніковы спіс твораў, што будуць разглядацца ў кожнай намінацыі. І яшчэ да 1 ліпеня ёсць магчымасць паспець падаць заяўку!

— Арганізатары запрасілі аўтараў прадставіць найлепшыя творы сваёй літаратурнай творчасці, якія ўпершыню былі выпушчаны выдавецкімі арганізацыямі Беларусі ў 2016 годзе, — адзначае **першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ.** — Мы зацікаўленыя ў тым, каб конкурс меў высокі ўзровень: гэта найлепшы паказчык таго, што літаратура Беларусі развіваецца. Гэта не прэмія Саюза пісьменнікаў Беларусі, удзел у Нацыянальнай літаратурнай прэміі мающь права ўзяць усе, хто жадае і хто лічыць свае творы дастойнымі. Заяўкі прымаюцца ад фізічных асоб (кожны можа яе падаць асабіста ці праз афіцыйнага прадстаўніка), ад творчых саюзаў, выдавецтваў, рэдакцый і сродкаў масавай інфармацыі, арганізацый культуры і адукацыі, навуковых арганізацый і тых, хто вядзе дзейнасць у галіне мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства. Так, і Саюз пісьменнікаў Беларусі вылучае прэтэндэнтаў, сёлета ў нас, здаецца, будуць прадстаўлены ўсе аддзяленні, толькі ў Магілёўскім палічылі, што Нацыянальная літаратурная прэмія — гэта вельмі адказна, і на яе варта вылучаць сапраўдныя з'явы ў галіне літаратуры. А вось кнігавыдаўцы лічаць, што сам факт з'яўлення кнігі ўжо сведчыць пра яе высокі ўзровень. Напрыклад, Лілія на Анцуг (выдавецтва «Чатыры чвэрці») адзначала, што бывае нават складана вылучыць нейкую адну кнігу, калі выдавец лічыць усе вартымі ўвагі і высокай ацэнкі. Вядома, пераважная большасць аўтараў у намінацыі дзіцячай літаратуры. Аўтараў, творы якіх вылучаюцца на прэмію ў намінацыі «найлепшы твор для дзяцей і юнацтва», Саюз пісьменнікаў планує прадставіць падчас сустрэчы ў адным з летнікаў: гэта было б жывое знаёмства з творчасцю найлепшых беларускіх дзіцячых пісьменнікаў. Пры тым што ў нас усяго сем намінацый. Пакуль менш работ у намінацыях публіцыстыкі, драматургіі, літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства. Але наогул сёлета навідавоку большая актыўнасць з боку творцаў і арганізацый, якія лічаць кагосьці вартымі высокай ацэнкі. Я лічу, што гэта сведчанне таго, што насамрэч кнігі айчынных аўтараў карыстаюцца ўвагай, іх чытаюць.

Заснавальнікамі прэміі выступаюць міністэрствы інфармацыі, культуры, адукацыі, Мінгарвыканкам і Саюз пісьменнікаў Беларусі. Пераможцы атрымаюць грашовую прэмію ў памеры 30 базавых велічынь. Пры вызначэнні найлепшых будуць улічвацца тыраж твора, водгукі чытачоў, рэцэнзіі крытыкаў, звесткі з бібліятэк пра тое, як прачыталі кнігу чытачы.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

■ Глядзім разам!

## Ліга Еўропы ў прамым эфіры

**У чацвер, 29 чэрвеня, спартыўны канал Белтэлерадыёкампаніі пакажа абодва дамашнія матчы першага кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы УЕФА з удзелам мінскага «Дынама» і салігорскага «Шахцёра».**

У 18.20 на тэлеканале «Беларусь 5» пачнецца прамая трансляцыя са стадыёна «Трактар», дзе мінскае «Дынама» прыме каманду з Фарэрскіх астравоў «Рунавік». А пасля заканчэння паўфінальнага матча Кубка канфедэрацый, які таксама трансліруе «Беларусь 5», у 23.00 будзе паказана гульня з удзелам салігорскага «Шахцёра» і літоўскай каманды «Судува».

У Белтэлерадыёкампаніі паведамілі, што ў інтарэсах балельшчыкаў, а таксама з прычыны адсутнасці асвятлення на стадыёне «Трактар», спецыялістамі тэлеканала «Беларусь 5» было прапанавана мінскаму «Дынама» пачаць матч у 18.30, а салігорскаму «Шахцёру» — у 20.30. Салігорцы адмовіліся ісці на прапанаваныя ўмовы і заявілі час пачатку свайго матча ў 19.00. Такім чынам, гульню з Салігорска тэлеканал «Беларусь 5» пакажа ў запісе.

Зараз вядуцца перамовы адносна паказу двух гасцявых матчаў мінскага «Дынама» і салігорскага «Шахцёра» ў рамках першага кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы УЕФА.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Напярэдадні падзеі

# СЭЛФІ НА ТАНКУ І СПЕВЫ ПА-БЕЛАРУСКУ

## Як яшчэ арганізатары прапануюць адзначыць Дзень Незалежнасці?

**Галоўнае свята нашай краіны, якое яшчэ з'яўляецца і Днём Рэспублікі, адзначаецца сёлета дваццаты раз. Каб зрабіць яго больш урачыстым і запамінальным, рыхтавацца пачалі загадзя. Прычым не толькі ў сталіцы. А каб здзівіць і без таго разбэшчаных шматлікімі ўрачыстасцямі мінчан і гасцей горада, арганізатары ўнеслі ў святочную праграму нямала ноу-хау. Не абыдзецца і без традыцый.**


Фота Надзеі БУЖАН.

Вось ужо каторы год запар адным з галоўных мерапрыемстваў святкавання стане военны парад. Раніцай 3 ліпеня каля абеліска «Мінск — горад-герой» урачыстым маршам пройдзе каля чатырох тысяч чалавек — военнаслужачыя, курсанты, суворайцы, прадстаўнікі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў, а таксама Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

— Усяго ў парадзе прымуць удзел прадстаўнікі 30 злучэнняў і вайсковых часцей, пяці ўстаноў адукацыі: разам з тымі, хто забяспечвае яго правядзенне, гэта каля 6 тысяч военнаслужачых, — адзначыў **начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны палкоўнік Уладзімір МАКАРАЎ.** — Упершыню будуць прадстаўлены ўсе механізаваныя брыгады сухапутных войскаў, а таксама ўсе брыгады сіл спецыяльных аперацый. Ніколі дагэтуль не ўдзельнічалі ў парадзе і войскі тэрытарыяльнай абароны.

Акрамя таго, гледачы парада, апошняя генеральная рэпетыцыя якога пройдзе, дарэчы, сёння ўвечары, змогуць убачыць больш як 500 адзінак колавай і гусенічнай тэхнікі. Баявыя машыны, сярод якіх і найноўшыя распрацоўкі айчыннага ВПК, у механізаванай калоне зменяць дасягненні народнай гаспадаркі. Нагадаем, па завяршэнні афіцыйнай часткі ўрачыстасці частка тэхнікі застанецца на праспекце: упершыню за гісторыю правядзення ў нашай краіне парадаў усе ахвотныя змогуць пазнаёміцца з тэхнікай бліжэй.

Толькі перш у небе над сталіцай з'явяцца асноўныя тыпы крылатых машын Ваенна-паветраных сіл і Войскаў проціпаветранай абароны Беларусі. Упершыню ў складзе паветранага эшалона будзе прадстаўлена авіяцыя Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і ДТСААФ. Акрамя таго, ад Ваенна-касмічных сіл Расійскай Федэрацыі ў парадзе прымуць удзел верталёты Ка-52, самалёты Су-34 і Су-27.

Але ж якое свята без песні! Шэраг святочных мерапрыемстваў распачне ўрачысты сход і канцэрт майстроў мастацтва нашай краіны «Каб любіць Беларусь», які адбудзецца ўжо 1 ліпеня ў Палацы Рэспублікі. Ужо другі год запар 2 ліпеня ў краіне пройдзе агульнарэспубліканская акцыя «Дзень вышыванкі». Распачне дзейства, якое адбудзецца на пляцоўцы каля Палаца спорту, арт-парад у вышыванках. Мерапрыемствы, звязаныя з прапагандай сімволікі нашай дзяржавы, культуры, мастацтва ў цэлым, працягнуцца аж да самага вечара і завершацца маладзёжнай дыскатэкай «Вышыванка.by».

Шмат спеваў, танцаў, прычым амаль на ўсіх пляцоўках сталіцы, чакае мінчан і гасцей горада 3 ліпеня. Увечары каля абеліска «Мінск — горад-герой» адбудзецца гала-канцэрт «Беларусь маладая мая», які стане своеасаблівай прэзентацыяй дасягненняў беларускай моладзі ў самых розных сферах. Да кульмінацыі канцэрта — традыцыйнай акцыі «Праспяваем гімн разам» — можна будзе далучыцца за пяць хвілін да адзінаццатай вечара.

Пасля салюта, які, як заўсёды, пачнецца за гадзіну да поўначы ў шасці пунктах горада, Міністэрствам культуры разам з Другім нацыянальным каналам і Мінгарвыканкамам падрыхтаваны сюрпрыз для моладзі — святочны канцэрт-дыскатэка з удзелам такіх беларускіх гуртоў, як NaviBand, «Лепрыконсы» і «Дразды».

— Адной з адметных рыс усіх святочных мерапрыемстваў з'яўляецца абапіранне на беларускі музычны матэрыял, — расказала **першы намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА.** — Ключавыя канцэрты ў нас заўжды праходзяць на беларускай мове, але сёлета часцей будуць гучаць творы айчынных паэтаў: прычым не толькі класікаў, якія добра ўсім нам вядомыя, а і нашых сучасных аўтараў. Свята будзе беларускім не толькі па назве, а і па духу — сапраўды нашым, дзяржаўным.

Набыць сувеніры, а таксама патрэбныя ў гаспадарцы рэчы можна будзе на выстаўцы-кірмашы майстроў народнай творчасці, якая разгорнецца каля Палаца спорту. Вядома ж, адпаведным чынам будзе арганізаваны гандаль, работа летніх кафэ.

А каб свята прайшло спакойна, ужо 2 ліпеня асабісты склад органаў унутраных спраў будзе пераведзены на ўзмоцнены варыянт нясення службы.

— Кругласутачна будуць працаваць аперацыйна-секцыйныя штабы, у якія будзе сцякацца інфармацыя з усіх месцаў святочных гулянняў, — паведаміў **начальнік упраўлення аховы правапарадку ГУАПП МУС Беларусі Дзмітрый КУР'ЯН.** — 3 ліпеня на святкаванні ў Мінску можна будзе трапіць праз 130 кантрольна-прапускных пунктаў. — Прадугледжана выстаўленне максімальна магчымай колькасці прапускных пунктаў, як толькі гэта дазваляе тэрыторыя. Усё робіцца для зручнасці грамадзян, каб яны маглі хутка і камфортна трапіць на свята. Для ветэранаў, цяжарных жанчын і грамадзян з дзецьмі будуць арганізаваны асобныя пункты пропуску. Даведацца пра іх можна будзе ў работнікаў міліцыі. Каля КПП будуць усталяваны камеры захоўвання, у якіх можна будзе пакінуць грувасткія рэчы.

Правядзенне парада ў Мінску неадрыўна звязана з перакрыццём сталічных магістраляў. ДАІ просіць гэта ўлічваць пры паездках на Дзень Незалежнасці.

— Уся інфармацыя аб гэтым будзе змешчана на нашым сайце gaiminsk.by, — зазначыў **старшы інспектар па асаблівых даручэннях аддзела ДПС УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Міхаіл КАРНІЕВІЧ.** — Тым жа, хто захоча паглядзець на парад, мы раім прыязджаць на грамадскім транспарце. Бо на асабістых аўтамабілях у цэнтр горада трапіць будзе праблематычна, а непасрэдна ў раён праходжання тэхнікі — немагчыма.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

# Малы бізнес на высокіх абцасах

**Паспяховыя жанчыны Беларусі імкнуцца стаць яшчэ больш паспяховымі. І дапамагае ім у гэтым праект па падтрымцы і развіцці жаночага прадпрымальніцтва, які ў рускім варыянце назвы абыграецца яшчэ і літарамі: «УспешнаЯ».**



Сумесная ініцыятыва па развіцці і падтрымцы жаночага прадпрымальніцтва Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця і банкаў краіны нарэшце стала актуальнай і для гамяльчанак. Паўсотні прыгожых прадстаўніц малога і сярэдняга бізнесу, якія прыйшлі на сустрэчу, пацвярджаюць важнасць выбранага фармату. **Кансультант для малога бізнесу ў Беларусі ад Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця Вольга КУЗНЯЦОВА** гаворыць, што арганізацыя ажыццяўляе комплексную праграму для жанчын у бізнесе. І па-першае, гэта дапамога жанчынам у фінансаванні праектаў.

— Тут мы працуем з банкамі-партнёрамі, якім выдзяляем грошы на гэтыя мэты. Таксама дапамагаем наняць міжнародных кансультантаў, якія могуць дапамагчы зразумець патрэбы жанчын у фінансаванні. У выніку ўсе банкі маюць спецыялізаваныя прадукты для жанчын. Кожны банк падышоў да распрацоўкі сваіх прадуктаў дастаткова крэатыўна. Другі аспект — нефінансавая дапамога. Мы даём грант і дапамагаем наняць кансультантаў для прасоўвання сваёй справы. Гэта можа быць распрацоўка вэб-сайта, укараненне сістэмы ўліку на прадпрыемстве, выхад на новыя рынкі... Мы таксама прапануем жанчынам набыць больш упэўненасці. У нас ёсць спецыялізаваныя трэнінгі, якія накіраваны на павышэнне прадпрымальніцкіх навыкаў. Тое, што мы запрашаем на гэтыя трэнінгі розных жанчын-прадпрымальніц, ставарае сяброўскую атмасферу, і яны многаму вучацца адна ў адной, — расказала Вольга Кузняцова.

Дарэчы, «Белінвестбанк», які стаў адным з арганізатараў сустрэчы ў Гомелі, прэзентаваў спецыяльна распрацаваныя крэдытныя прадукты, прызначаныя для падтрымкі жанчын у бізнесе: «лэдзі-старт» і «лэдзі-інвест».

**Старшыня абласной арганізацыі Беларускага саюза жанчын Галіна ПАШЭД** кажа, што напярэдадні было праведзена анкетаванне сярод жанчын-прадпрымальнікаў Гомельшчыны:

— На першае месца жанчыны ставяць задачу кансультавання, атрымання дадатковай інфармацыі, стварэння бізнес-платформы, дзе яны маглі б абменьвацца думкамі, заводзіць кантакты. Сёння больш за 60% прадпрымальніц — гэта жанчыны ад 37 да 55 гадоў. Такім чынам, у нас вялікі рэзерв для развіцця жаночага прадпрымальніцтва — ад 18 да 37 гадоў. Прынамсі, на Гомельшчыне трэцяя частка прадпрыемстваў пад кіраўніцтвам жанчын узнікла пасля 2010 года. Гэта гаворыць пра ўсплёск актыўнасці жаночага прадпрымальніцтва ў нашай вобласці. Нашы жанчыны асноўнай крыніцай фінансавання называюць асабістыя сродкі. Пазыковымі карыстаецца толькі 1/3. Толькі адзін чалавек сказаў пра фінансавую дапамогу дзяржавы. Ведаеце, чаму жанчыны прыходзяць у бізнес? 80% з апытаных адказалі: таму, што ў іх была свая ідэя. І астатнія 20 — для таго, каб эканамічна падтрымаць сваю сям'ю. У Расіі, дарэчы, наадварот.

Між тым гомельскія прадпрымальніцы высока ацанілі банкаўскія ініцыятывы і неабходнасць правядзення такіх сумесных сустрэч. Некаторыя з іх расказалі пра свой асабісты шлях, які зусім не быў пакрыты пялёсткамі кветак. Лілія Калюжная ў 2008 годзе засталася ўдавой з двума дзецьмі. Дачка была зусім маленькая — паўтара года.

— Мне прыйшлося вельмі шмат працаваць. Калі раней думала, што я толькі муза свайго каханага, то потым прыйшлося навучыцца кіраваць і рабіць тое, што рабіў мой муж. Сёння я пачынаю яшчэ і новы праект, які будзе скіраваны на падтрымку творчасці і аўтарскіх вырабаў мясцовых рамеснікаў, — падзялілася Лілія.

Іна Кустова прадстаўляе грамадскае аб'яднанне «Адзінства», якое садзейнічае развіццю прыватнага прадпрымальніцтва. Яна гаворыць, што і для жанчыны ў бізнесе сям'я і дзеці заўсёды застаюцца на першым месцы:

— У мужчыны бізнес — гэта галоўная частка жыцця. А жанчыне вельмі складана сумяшчаць, бо ўласная справа патрабуе каласальнай увагі. Менавіта таму жаночае прадпрымальніцтва мае патрэбу ў падтрымцы. Праект сапраўды значны. Ва ўдзельніц ёсць магчымасць не толькі атрымаць шмат новых ведаў, пазнаць сакрэты поспеху калег і ўжываць іх у сваёй практыцы, але і падзяліцца праблемамі і нават паспрабаваць іх вырашыць, заручыўшыся падтрымкай бізнес-супольнасці.

Праект «УспешнаЯ» будзе праходзіць на працягу 2017 года і ахопіць усе рэгіёны Беларусі. Сёння стаць яго ўдзельнікамі ўжо змаглі больш 120 жанчын-прадпрымальніц сталіцы, а таксама Брэста і Гомеля. Цяпер віцебскія прадпрымальніцы чакаюць прапановы, якія для іх рыхтуюць «Белінвестбанк» і Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Сезонны смак

# НА СВЕЖЫХ ВЯРШКАХ

## Журналістам паказалі, як на адным з найбуйнейшых прадпрыемстваў краіны выпрацоўваюць 60 тон марожанага ў суткі, у тым ліку пламбір з яшчэ большай колькасцю вяршкоў

**Да летняга сезона кампанія «Санта Брэмар» выпусціла пад гандлёвай маркай «Юкі» лінейку пламбіраў, выпрацаваных з адборных натуральных вяршкоў. Склад новага пламбіру, які ўжо можна адшукаць у гандлёвай сетцы, удасканалены паводле спажывецкіх упадабанняў. Даследаванне рынку паказала, што самы папулярны ў беларусаў від марожанага ў рознай фасоўцы — гэта пламбір, да смаку і складу якога наш спажывец прад'яўляе самыя высокія патрабаванні.**



«Мы дадалі яшчэ больш свежых вяршкоў, аб чым сведчыць сама назва прадукту — «Юкі. Пламбір на вяршках», што азначае ў нашым разуменні дасканалы смак — сметанковы, аксамітны, і, адпаведна, тлустасць ужо не 12, а 15 працэнтаў, — адзначае **начальнік аддзела маркетынгу СП «Санта Брэмар» Алеся ЕЛІНА.** — Нягледзячы на тое, што сабекошт такога прадукту вырас, на цане гэта не адаб'ецца. Мы пастаўляем марожанае не толькі на айчынны рынак, але і ў Расію, Ізраіль, Малдову, Грузію, Канаду, пробную партыю адправілі ў Кітай. Летам вырабляем да 60 тон марожанага ў суткі, але для нас важна не толькі нарасціць аб'ёмы, але і знайсці цікавую ідэю, якая будзе прадавацца, бо рынак марожанага ў краіне звужаецца, а канкурэнцыя расце».

Малако гатунку «экстра» і вяршкі для новага пламбіру закупляюцца ў прадпрыемства «Савушкіна», уласнай гаспадаркі кампаніі «Савушкін прадукт». Сучасная малочнатаварная ферма на 3 тысячы кароў аснашчана адзінай пакуль у краіне нямецкай устаноўкай для даення «Карусель». Тут ад кожнай каровы атрымліваюць каля 23 кг малака ў суткі. Уся жывёла — толькі айчыннай селекцыі.

Пункт прыёму вяршкоў і малака на «Санта Брэмар» цалкам аўтаматызаваны, доўга на складзе сыравіна не затрымліваецца — амаль адразу адпраўляецца ў цэх, у велізарны блэндар, дзе перамешваюцца сухія і вадкія кампаненты. Яны раствараюцца, пастэрызуюцца і адпраўляюцца на гамагенізацыю, неабходную для таго, каб структура была аднароднай, далікатнай, як мы любім, а не з кавалачкамі лёду і малочнага тлушчу. Далей сумесь ахалоджваецца і адпраўляецца на выспяванне ў 6-тонныя ёмістасці, на якіх так і пазначана: «Сумесь марожанага». На наступным этапе — фрэзеравання — сумесь узбіваецца і замарожваецца да -5 градусаў. Фактычна гэта ўжо гатовы прадукт — мяккае марожанае. Яно дазіруецца — размяркоўваецца па вафельных кубачках або ў яго ўбіваецца палачка, пасля чаго адпраўляецца ў шафу з тэмпературай каля -35... Цікава, што ў адным цэху ўстаноўлены адразу сем вытворчых ліній — такая колькасць марожанага, якую можна ахапіць вокам, пэўна, дзецям і ў снах не сніцца.

Абсталяванне італьянскай, нямецкай і польскай вытворчасці дазваляе ўвасобіць фактычна любую фантазію. І не дзіва, што менавіта тут выпускаюцца жэлейны лёд і лёд з мармеладным стрыжнем, марожанае-суфле і ёгуртнае, шматслойныя рулеты і торты з бісквітамі... Нараджаецца марожанае на працягу 6 гадзін, а з'ядаецца... за імгненне.

Мяккае марожанае, дарэчы, аказалася сапраўды неймаверна далікатным, аксамітным. І што самае важнае, кубачак у гэтым варыянце — хрумсткі! Шкада, што гэта знікае ў працэсе захоўвання. Кубачкі і ражкі «Санта» набывае ва Украіне, кампаненты для глазуры завозяцца з Прыбалтыкі. Закупляецца і камедзь ражковага дрэва, і некаторыя іншыя кампаненты, але галоўныя складнікі — айчынныя.

Выпрацоўваюць марожанае ў Беларусі ажно 24 вытворцы, але спажыванне гэтага прадукту ў нас чамусьці нізкае — усяго каля 2,5 кг у год на чалавека. Можа, возьмем прыклад з фінаў? У Фінляндыі на кожнага жыхара прыпадае 8,7 кг!

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Дзень горада

# ЯК У ВІЦЕБСКУ СПРАВІЛІ ІМЯНІНЫ

**Чатыры дні ў Віцебску праводзілі мерапрыемствы, прысвечаныя Дню горада. Сёлета святкавалі 1043-ю гадавіну заснавання. Чарговыя імяніны, бадай, у першую чаргу запомняцца тым, што былі ўсталяваныя скульптуры казачных персанажаў.**

У прыватнасці, на постсавецкай прасторы ўсе ведаюць Старога Хатабыча. Чалавек, які яго прыдумаў, — пісьменнік і паэт Лазар Гінзбург (псеўданім Лагін), — у 1903 годзе нарадзіўся ў Віцебску. У бедная яўрэйскай сям'і ён быў старэйшым з пяцярых дзяцей. Яго бацька займаўся перагонам плытоў па Заходняй Дзвіне.

Цяпер Хатабыча вышынёй каля 1,8 метра, якога выканаў вядомы віцебскі скульптар Сяргей Сотнікаў, можна ўбачыць насупраць Беларускага тэатра «Лялька». Артысты на цырымоніі прэзентацыі скульптуры пастараліся, каб казка стала явай. Вельмі хочацца спадзявацца, што будзе адноўлены і дом, дзе нарадзіўся «бацька» Старога Хатабыча. Ён знаходзіўся непадалёку ад таго месца, дзе ўсталявалі скульптуру, на былой Падзвінскай вуліцы (цяпер — Талстога). На сёння на месцы дома капітальных забудоў няма.

Журналіст «Звязды» ідэю аднаўлення дома Гінзбурга агучыў кіраўніку «Газпрама». І Аляксей Мілер канстатаваў, што яна цікавая. Упэўнены, калі ў гарвыканкаме падрыхтуюць афіцыйную прапанову з разлікам сумы фінансавання, знойдуцца ахвотныя інвеставаць.

Яшчэ адна новая скульптура, падораная Віцебску мясцовай уладай на імяніны, — «Рыбка». Усталявалі яе ў раёне ўпадзення ракі Віцьба ў Заходнюю Дзвіну. Аўтары ідэі згадалі, што Пушкін, які напісаў казку пра залатую рыбку, двойчы праязджаў горад. Плюс рыбалоўства — традыцыйны промысел тутэйшых. Цяпер у горадзе з'явілася яшчэ адно месца, дзе можна фатаграфавацца, куды будуць прыходзіць турысты. У роце рыбкі ключ з надпісам «Віцебск» і выявай герба горада. Скульптуру з матэрыялу «пад бронзу» вышынёй 2,3 метра зрабіў мясцовы творца Іван Казак.

Прыемным падарункам гараджанам стаў і новы тралейбусны маршрут №11. Дзякуючы яму можна ад чыгуначнага вакзала даехаць да новага «спальнага» мікрараёна «Медцэнтр» і наадварот.

Падчас святкавання ў горадзе прайшлі дзясяткі мерапрыемстваў. Можна было ўбачыць выстаўку «130 гадоў — 130 шэдэўраў» — рэтраспектыву творчасці Марка Шагала са збору музея. Другі раз прайшоў «ФотаКРОК» — конкурс фатаграфіі імя Сігізмунда Юркоўскага. Правялі акцыю да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і літаратурна-музычнае свята «Барадулінкі». Шмат гледачоў пабывалі на «Аўтарэтра» — выстаўцы аўтамабіляў, канцэрце-імправізацыі аўтарскай песні «Музыка віцебскіх вуліц». Традыцыйна папулярнымі сталі выстаўка-кірмаш работ мастакоў, народных майстроў, навучэнцаў.

На канцэртнай праграме «З Днём нараджэння, любімы горад!» губернатар Віцебшчыны Мікалай Шарстнёў паведаміў: горад у 2020 годзе прыме абласныя «Дажынкі». І па добрай традыцыі напярэдадні будзе многае зроблена: рамонт і рэканструкцыя вуліц, паркаў, будынкаў і іншае.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

28 чэрвеня 2017 г.
№23 (407)


## Ушанавалі лепшых старастаў і старшынь дамавых камітэтаў

**У Брэсце прайшоў семінар-вучоба для старшынь сельскіх і раённых Саветаў. Мерапрыемства праводзілася ў рэжыме відэаканферэнцыі. Але да яго прымеркавалі падвядзенне вынікаў абласнога спаборніцтва за мінулы год і пераможцаў запрасілі на семінар, каб адзначыць іх заслужанымі ўзнагародамі ва ўрачыстай абстаноўцы.**

Граматы і грашовыя прэміі старшыня абласнога Савета Сяргей АШМЯНЦАЎ уручыў старастам: Таісе Чапайла з вёскі Падкраічы Бярозаўскага раёна — за першае месца (пра работу Таісы Васілеўны расказвалася ў нумары «МС» за 24 мая гэтага года), Аляксандру Журбілу з Пінкавічаў Пінскага раёна і Мікалаю Акаронку з Хомска Драгічынскага раёна, якія раздзялілі другое месца, а таксама Васілю Масляку з вёскі Махро Іванаўскага раёна і Надзеі Чарнак з Альхоўкі Кобрынскага раёна — за трэцяе.

Самымі ініцыятыўнымі старшынямі дамавых камітэтаў па выніках мінулага года прызнаныя: пінчанка Наталля Качаноўская, Сяргей Барушка з Кобрына і Валянціна Серада з аграгарадка Белавежскі Камянецкага раёна.

Падведзены вынікі спаборніцтва сельскіх Саветаў у справе вырашэння пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва. Першае месца прысуджана Целяханскаму Савету Івацэвіцкага раёна, другое раздзялілі Белавушскі Столінскага і Пескаўскі Бярозаўскага раёнаў, трэцімі сталі Дварэцкі на Лунінеччыне і Раснянскі Камянецкага раёна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

ТЭМА ТЫДНЯ

# КАБ ЖЫЦЦЁ НЕ СТАЛА ПАЛАСОЙ ПЕРАШКОД...

***Нам трэба не змагацца з бар'ерамі, а пашыраць даступнасць***



Фота БЕЛТА.

**АСЯРОДДЗЕ, даступнае для людзей з абмежаваннямі, — патрабаванне, з якім сёння сутыкаецца кожны сучасны населены пункт. У наш час яно становіцца амаль такім жа абавязковым, як вада, каналізацыя і электрычнасць. І, дарэчы, датычыцца яно не толькі людзей з інваліднасцю. Ніхто не застрахаваны ад таго, што ў нейкі перыяд жыцця можа страціць мабільнасць і здольнасць самастойна перасоўвацца. Прыступкі ў доме без ліфта могуць стаць непераадольнай перашкодай і для пажылога чалавека, і для маладой мамы з каляскай, і для таго, хто атрымаў траўму. Так што мерапрыемствы па стварэнні даступнага асяроддзя могуць аказацца патрэбнымі ўсім.**

стар. 4–5

ПРАБЛЕМА І РАШЭННЕ

# Работа знаходзіць таго, хто яе шукае

## Раённыя цэнтры занятасці навучаюць спецыяльнасцям швачак, качагараў, рабочых па доглядзе будынкаў

**Працаўладкаванне па-ранейшаму застаецца адной з самых актуальных праблем сённяшняга дня. Для большасці з нас работа з'яўляецца асноўнай крыніцай сродкаў існавання. Таму страта рабочага месца нярэдка становіцца не проста пытаннем на парадку дня, але і сапраўднай сямейнай драмай.**

**Пра гэта гаварыў з журналістамі памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Васіль Герасімаў перад прыёмам грамадзян у Бярозаўскім раёне. Тады ж у ліку раёнаў з напружанай сітуацыяй па беспрацоўі называўся і Кобрынскі.**

### Колькасць вакансій расце

Ды і ў іншых раёнах праблема прысутнічае. Крыху адрозніваюцца лічбы, астатнія аспекты падобныя. Варта сказаць, што і Дэкрэт №3 падштурхнуў актыўнасць грамадзян, якія не надта спяшаліся шукаць работу, а цяпер пайшлі ў службу занятасці.




Намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Кобрынскага райвыканкама Ірына КУЗІЧ гаворыць, што з пачатку года ў аддзел занятасці звярнулася 1740 чалавек, 1089 з іх былі зарэгістраваны ў якасці беспрацоўных. Пачынаючы з 1 студзеня 1064 грамадзянам было аказана садзейнічанне ў працаўладкаванні. Зараз на ўліку значацца 434 беспрацоўныя, а ў банку вакансій — 329 прапаноў.

Ірына Вячаславаўна адзначыла станоўчую тэндэнцыю: колькасць вакансій расце. Так, за дзве дэкады чэрвеня іх дадалося паўсотні. Летні сезон, як правіла, характарызуецца ажыўленнем на рынку працы, з'яўляюцца прапановы сезонных работ. Рабочыя рукі патрэбныя. І той, хто хоча знайсці магчымасць зарабіць, можа гэта зрабіць — упэўнена намеснік начальніка ўпраўлення.

стар. 3

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# УЗАЕМАЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ ПАЦВЕРДЗІЛІ

## Віцэ-спікер верхняй палаты сустрэлася з намеснікам міністра замежных спраў Італіі



**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна Шчоткіна сустрэлася з дэлегацыяй Міністэрства замежных спраў і міжнароднага супрацоўніцтва Італьянскай Рэспублікі. Яе ўзначаліў статс-сакратар (намеснік міністра), дэпутат парламента Італіі Вінчэнца Амендола. Дэлегацыя прыбыла ў Рэспубліку Беларусь для правядзення кансультацый паміж МЗС і для ўдзелу ў мерапрыемствах у рамках сустрэчы міністраў замежных спраў Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы.**

Падчас перамоў былі абмеркаваны шырокі спектр пытанняў двухбаковых адносін, у тым ліку міжпарламенцкае ўзаемадзеянне і гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. Бакі выказалі ўзаемную зацікаўленасць у далейшым пашырэнні ўзаемавыгадных сувязяў. У сустрэчы з беларускага боку таксама прынялі ўдзел старшыні пастаянных камісій Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў, па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ала Бодак, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Італьянскай Рэспубліцы і на Мальце, Пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь пры ФАО Аляксандр Гур'янаў.

# ДА ФОРУМУ — ГАТОВЫ

## У Савеце Рэспублікі абмеркавалі падрыхтоўку да важнай падзеі

**У Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова адбылася нарада па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення чацвёртага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.**

Удзельнікі мерапрыемства дэталёва разгледзелі пытанні правядзення пленарнага пасяджэння, работы секцыі «Ад рэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі да супрацоўніцтва гарадоў і раёнаў: новыя магчымасці і перспектывы». З улікам абмеркавання перспектыўных кірункаў беларуска-расійскага ўзаемадзеяння асаблівая ўвага была звернута на неабходнасць стварэння маштабных сумесных праектаў.

У нарадзе прынялі ўдзел міністр прамысловасці Віталь Воўк, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Заяц, міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Аляксей Васільеў, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Алег Барысенка, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Васіль Панасюк.

# ПРА ЛАКАЛЬНАЕ І ГЛАБАЛЬНАЕ

## У верхняй палаце адказалі на пытанні грамадзян

У суботу, 24 чэрвеня, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў правёў тэматычную прамую тэлефонную лінію па пытаннях міжнароднага супрацоўніцтва і нацыянальнай бяспекі. Званкі ад грамадзян прымаліся з 10.00 да 12.00 гадзін.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ЗВЯРТАЮЦЦА — ЗНАЧЫЦЬ ДАВЯРАЮЦЬ

**У Віцебскім аблвыканкаме адбылася прамая лінія з Аляксандрам ПАПКОВЫМ, старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. На працягу дзвюх гадзін да яго звярнулася каля 10 чалавек.**



Заяўніца з Багушэўска, гарадскога пасёлка ў Сенненскім раёне, агучыла праблему чэргаў да хірурга ў паліклініцы. Ён прымае не штодня, а пару разоў на тыдзень. У выніку мясцовым жыхарам прыходзіцца ездзіць да вузкага спецыяліста ў райцэнтр. А бывае, і ў Віцебск. Жанчына расказала і пра іншыя непрыемныя нюансы, якія датычацца медыцынскага абслугоўвання. Аляксандр Папкоў адразу па тэлефоне перадаў сутнасць скаргі кіраўніку абласной сістэмы аховы здароўя. І пачуў абяцанне абавязкова прыняць аптымальнае рашэнне, каб жыхары глыбінкі засталіся задаволенымі.

Жыхарка Віцебска паскардзілася, што ў кватэры шматпавярховага дома некамфортна з-за непрацуючай вентыляцыі. Лічыць, што вінаватыя ў гэтым суседзі зверху... Прадстаўнікі мясцовай улады ў курсе пытання. Раней спецыялісты па даручэнні мэра даследавалі жыллё, але не знайшлі ніякіх адхіленняў... Сенатар звярнуўся да старшыні Віцебскага гарвыканкама і папрасіў праявіць максімальную чуласць у дадзенай сітуацыі.

Спадзявалася на падтрымку ў некалькіх пытаннях і жыхарка Оршы. Менавіта пра такіх людзей гавораць, што яны не раўнадушныя да ўсяго, што адбываецца побач. У прыватнасці, жанчына канстатавала, што ў сантэхнікаў маленькая зарплата — каля 320 рублёў у месяц. Пацікавілася і тым, ці збіраюцца рамантаваць будынак, які толькі напалову выкарыстоўваецца як інтэрнат, а на другой палове ў вокнах няма шыбаў, памяшканні не ацяпляюцца... Яшчэ ініцыятыўная жанчына турбуецца за лёс былога кіраўніка і дырыжора аркестра рускіх народных інструментаў, які больш не працуе. Пры гэтым калектыў — лаўрэат шматлікіх конкурсаў, фестываляў. Выступленні выклікалі фурор і высока ацэньваліся прафесійнымі музыкантамі, музыказнаўцамі. Даручана высветліць сітуацыю.

Некалькі чалавек папрасілі дапамагчы ўладкавацца на працу. У прыватнасці, сваю гісторыю расказала былы начальнік паштовага аддзялення ў Дубровенскім раёне. Па сямейных абставінах жанчына пераехала ў абласны цэнтр, але тут яе нікуды не бяруць. У яе сярэдняя спецыяльная адукацыя, дыплом бухгалтара, але без адпаведнага стажу... Аляксандр Папкоў папрасіў кіраўніка Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама пастарацца дапамагчы ў вырашэнні праблемы. Як і былому сантэхніку з Віцебска, і медсястры з Сенненскага раёна. Дарэчы, апошнія не ўтойвалі, што самі вінаватыя ў тым, што страцілі працу. Але падкрэслілі, што зрабілі правільныя высновы. А як вядома, у чалавека заўсёды ёсць шанц на падтрымку, калі ён насамрэч усвядоміў, што не меў рацыі...

Пасля прамой лініі Аляксандр Папкоў падзяліўся ўражаннямі:

— Калі людзі звяртаюцца па пытаннях, якія іх хвалююць, значыць, вераць уладзе! І гэта вельмі добра.

На яго погляд, на Віцебшчыне службы, супрацоўнікі інстанцый, якія адказваюць за работу са зваротамі грамадзян, працуюць празрыста і зразумела. Умеюць кантактаваць з людзьмі і знаходзіць рашэнні пытанняў. Калі ж незадаволеныя зноў тэлефануюць ці пішуць, прыходзяць на прыёмы, трэба пастарацца нейкім чынам паўплываць на прыняцце адпаведных рашэнняў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

# ДЭПУТАТАЎ РЫХТУЮЦЬ... СА ШКОЛЫ



Верхнюю палату наведалі прадстаўнікі Чавускага маладзёжнага парламента

**Па словах Уладзіміра ПАНЦЮХОВА, старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, у Чавускім раёне ідэя ладзіць сустрэчы для актыву мясцовага самакіравання існуе даўно. Гэтым разам моладзь па запрашэнні старшыні камісіі наведала верхнюю палату беларускага парламента, дзе пабывала на экскурсіі, сустрэлася з парламентарыямі ад свайго раёна і нават атрымала магчымасць адчуць сябе сенатарамі, націснуўшы на кнопку ў авальнай зале Савета Рэспублікі.**

***Алег МАЦЮЛІН, старшыня Чавускага раённага Савета дэпутатаў,*** расказаў, што ў маладзёжны парламент пры Чавускім раёне ўваходзіць 30 дэлегатаў ад 14 да 31 года. У ім — прадстаўнікі прадпрыемстваў, аграрадкоў і школ, у якіх не менш за 15 членаў БРСМ. Не радзей чым раз на два гады збіраецца сесія такога парламента, рашэнні якой носяць рэкамендацыйны характар. Затым іх даводзяць да ведама грамадзян, навучэнцаў, моладзі і дэпутатаў раённага Савета. Акрамя таго, маладыя людзі бяруць удзел у сесіях сваіх дарослых калег і таксама сустракаюцца з выбаршчыкамі. Сённяшні склад маладзёжнага парламента зусім «свежы» — у Чавускім раёне яго абралі сёлета ў студзені. На думку старшыні райсавета, такія дэпутаты могуць лепш бачыць праблемы на месцах і дапамагаць іх вырашаць на больш высокім узроўні. У чым, у прынцыпе, і заключаецца сутнасць мясцовага самакіравання.

Увогуле маладзёжны парламент — добрая школа для тых, хто збіраецца ўзяць удзел у наступных выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў і не спыніцца на дасягнутым. «Наша задача — рыхтаваць маладых людзей для таго, каб яны працавалі надалей. Мы супрацоўнічаем з імі як з будучымі кандыдатамі ў Саветы дэпутатаў розных узроўняў. Гэта робіцца ў тым ліку для таго, каб падтрымаць іх аўтарытэт, — кажа Алег Мацюлін. — На жаль, наша моладзь часта бывае пасіўная, праяўляць сябе не кожны хоча. Таму мы на мясцовым узроўні імкнёмся заахвочваць любыя іх імкненні і ініцыятывы».

У сваю чаргу **дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Анатоль ХІШЧАНКА** лічыць, што маладзёжны парламент рыхтуе будучых прафесіяналаў-заканадаўцаў: «У любой акрузе парламент — гэта першая ступень рэспубліканскага парламентарызму, а наступная ступень — гэта непасрэдна парламент».

Удзельнікі маладзёжнага парламента сустрэліся са **старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімірам ПАНЦЮХОВЫМ,** які расказаў, як стаў сенатарам, пра што ў дзяцінстве нават марыць не мог. «Стаўце перад сабой мэты і дасягайце іх, невялікімі крокамі штодзённа ідзіце па вызначаным шляху. Не спыняйцеся, рызыкуйце! Які сэнс мае наша жыццё, калі гэта не вечнае імкненне да лепшага?..», — звярнуўся парламентарый да моладзі.

Уладзімір Панцюхоў расказаў гасцям пра галоўны заканадаўчы орган нашай краіны, яго структуру і задачы, якія стаяць перад сенатарамі. Так, за пятае скліканне (з 2012 па 2016 год) Саветам Рэспублікі было адобрана 414 законапраектаў, з іх 3 кодэксы, і прынята да ведама 23 Дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Члены Савета Рэспублікі пры іх прыняцці робяць усё магчымае, каб законы былі справядлівымі і іх прызнавалі такімі людзі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# Работа знаходзіць таго, хто яе шукае

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Але пры пошуку работы не ўсе саіскальнікі хочуць працаваць па-сапраўднаму — адзначаюць спецыялісты. Напрыклад, у Кобрынскім раёне ёсць прыватнае сельгаспрадпрыемства з італьянскім капіталам, якое не можа набраць сабе агароднікаў з мясцовых нават на летні сезон. Калі тутэйшыя беспрацоўныя пабываюць на плантацыі, азнаёмяцца з умовамі працы, з патрабаваннямі дысцыпліны, яны, як правіла, адмаўляюцца заключаць дагаворы. У выніку агародніну вырошчваюць прыезджыя работнікі. Кобрыншчына мяжуе з Украінай, а ўкраінскія беспрацоўныя хапаюцца за магчымасць зарабіць нават нялёгкай працай на зямлі.

## Патрэбна матывацыя

Начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Бярозаўскага райвыканкама Маргарыта ТАЛКУН адзначыла сярод асаблівасцяў шэрагу беспрацоўных адсутнасць матывацыі да працы. Маргарыта Мікалаеўна прывяла прыклады адносін да працы наваспечаных дворнікаў. Аднаго з іх уладкавалі на работу з вялікімі цяжкасцямі. Начальнік упраўлення нават папрасіла кіраўніка структуры адправіць на заслужаны адпачынак 65-гадовага работніка, бо трэба было ўладкаваць маладога. Чалавек пайшоў на месца дворніка, якое вызвалілася, і, паводле водгукаў кіраўніцтва, добра працуе. Таму што яму патрэбна была работа, ён сваім месцам даражыць.

А другі, амаль яго равеснік, калі яго ўладкавалі дворнікам, пабыў на новай пасадзе пару дзён, а потым сказаў: «Падмятаць кожны дзень і быць занятым восем гадзін на дню не ўваходзіла ў мае планы». Гэтак жа як і дзяўчына, якую ўладкавалі весці гурток самадзейнасці ў дзіцячай пазашкольнай установе. Маладая работніца з культпрасветадукацыяй заявіла, што ёй не падабаецца работа, дзе трэба спяваць, танцаваць і таму падобнае. Яна разлічвала на спакойны рэжым працы, дзе можна было б «пасядзець некалькі гадзін у кабінеце», таму звольнілася са сваёй пасады праз два тыдні. Яшчэ адзін малады чалавек з дыпломам юрыста сказаў, што ён не будзе разглядаць прапановы з аплатай менш за 800 рублёў. Такім грамадзянам вельмі цяжка дапамагчы. Хоць для пачатку працоўнай кар'еры асабліва маладым людзям не варта было б пазбягаць любой работы — лічыць Маргарыта Мікалаеўна.

## Пытанне аплаты

На выязной сесіі Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў па пытаннях занятасці была закранута праблема пошуку кадраў для швейных прадпрыемстваў. Пасля некаторага зацішша швейнікі актывізаваліся. Зараз вострую патрэбу ў рабочых руках швачак маюць пяць прадпрыемстваў Кобрыншчыны. Шыць адзенне з джынсавых тканін пачала фірма, заснавальнікам якой з'яўляецца турэцкае прадпрыемства. Ёсць у Кобрыне філіял «Мілавіцы», адкрытыя іншыя швейныя вытворчасці. Але яны сёння не гатовыя плаціць работніцам больш чым




300—350 рублёў у месяц. У тым і праблема. А яшчэ колькі гадоў таму швачкі атрымлівалі вельмі прыстойную зарплату, выседзець восем гадзін за канвеерам, напружваючы зрок і рукі, не лёгка. У выніку нават адну групу для навучання швейнай прафесіі кобрынская служба занятасці сабраць там не змагла. Значыць, тут трэба мяняць некаторыя падыходы работадаўцам.

## Навучанне і перападрыхтоўка

Як станоўчы, на кобрынскім дэпутацкім форуме адзначаны факт набору на навучанне групы мужчын. Пасля адпаведных курсаў яны будуць уладкаваныя рабочымі па абслугоўванні школьных будынкаў. І хоць зарплату там абяцаюць не вельмі высокую, недзе каля 300 рублёў, ахвотныя працаваць у школах знайшліся.

— Зараз набіраецца група для падрыхтоўкі машыністаў-качагараў кацельных, — паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Столінскага райвыканкама Генадзь ЯХНАВЕЦ. — Яны будуць навучацца на базе нашага сельскагаспадарчага ліцэя. Пачатак заняткаў прызначаны на жнівень — з тым, каб да ацяпляльнага сезона людзі прыступілі да сваіх абавязкаў. Усе качагары будуць вучыцца пад гарантыю працаўладкавання за кошт сродкаў фонду сацыяльнай абароны. Слухачы курсаў атрымаюць стыпендыю, кампенсацыю за праезд да месца вучобы і, галоўнае, магчымасць атрымаць рабочае месца. Таму ахвотныя на гэтую групу набіраюцца.

Сёлета некалькі чалавек з ліку тых, хто звярнуўся ў Столінскі цэнтр занятасці, накіроўвалі на вучобу ў Брэст. Малады чалавек, які атрымаў спецыяльнасць тынкоўшчыка-абліцоўшчыка-плітачніка, ужо вярнуўся дадому і ўладкаваўся на работу.

Дарэчы, на 1 чэрвеня ў Столінскім раёне было зарэгістравана ў якасці беспрацоўных 93 чалавекі. Вакансій у раёне на гэтую дату значна больш. Але ў асноўным патрабуюцца спецыялісты з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Бальніца гатовая прыняць дактароў, сельгаспрадпрыемствы — ветэрынараў, лясная гаспадарка — леснікоў. А вось з рабочымі вакансіямі сітуацыя складаная. Але хто вельмі хоча знайсці работу, таму ўдаецца — пераканаными ў раённых службах занятасці.

***

*Мае знаёмыя муж і жонка, вясковыя настаўнікі з Пінскага раёна, перажылі закрыццё ўласнай школы, дзе адпрацавалі з часоў універсітэцкага размеркавання. Цяпер жонка ездзіць на працу ў райцэнтр больш за 20 кіламетраў, муж — у іншую вёску яшчэ далей. Пры тым, што яму пасля складанай аперацыі цяжка хадзіць і абое дабіраюцца рэйсавымі аўтобусамі, на жыццё асабліва не скардзяцца. «Пенсійны ўзрост паднялі, ездзіць давядзецца яшчэ доўга, але ж трэба недзе працаваць», — разважаюць Аляксандр і Таццяна... Я пра тое, што калі чалавек хоча мець работу, ён такую магчымасць знаходзіць.*

*У службах занятасці ў адзін голас адзначаюць, што найцяжэй працаваць са спецыфічным кантынгентам, які складаюць хранічна непрацуючыя, выхадцы з ЛПП і месцаў пазбаўлення волі. Іх уладкоўваюць, яны пачынаюць парушаць дысцыпліну, іх звальняюць, і яны зноў ходзяць па крузе. Калі чалавек не мае матывацыі, уладкоўваць яго — марны занятак. Працаваць трэба хацець.*

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

НАВІНЫ З РЭГІЁНАЎ

## Вакол святла

**Брэст.** Выстаўка лямпаў і ліхтароў «Вакол святла» адкрылася ў Брэсцкай абласной навукова-тэхнічнай бібліятэцы. Прадстаўленыя на ёй экспанаты адлюстроўваюць эвалюцыю асвятляльных прыбораў, якімі карысталася і карыстаецца чалавецтва. Гэта газавыя і электрычныя лямпы, падсвечнікі, абажуры, чыгуначныя і вулічныя ліхтары, кішэнныя ліхтарыкі, прыстасаванні для гашэння свечак, запалкі, запальнічкі і іншыя прадметы, што ў XIX—XX стагоддзях ужываліся для асвятлення. Усяго наведвальнікі выстаўкі змогуць пабачыць больш за 100 экспанатаў.

## Стронга на экспарт

**Магілёўская вобласць.** Прадпрыемства «Лахва» налета плануе выйсці на вытворчасць 700 т стронгі на год. Пра гэта заявіў дырэктар гаспадаркі Юрый Куксянкоў. Гэтая каштоўная рыба запатрабаваная на рынку, прычым значная яе частка ідзе на экспарт у Расію. Стронга гадуецца ў трох падраздзяленнях гаспадаркі, што знаходзяцца ў Быхаўскім, Касцюковіцкім і Бялыніцкім раёнах. У перспектыве мае быць пабудаваны яшчэ адзін сучасны комплекс для гадоўлі 300 т рыбы на год. Плануецца таксама развіваць турыстычную інфраструктуру, аказваць паслугі платнай рыбалкі і ўвесці цэх перапрацоўкі ікры.

Гаспадарка «Лахва» была створаная пры рэалізацыі інавацыйнага праекта па вытворчасці рыбы каштоўных парод у Быхаўскім раёне ў 2013 годзе.

## Княжацкі квэст

**Мір, Гродзенская вобласць.** Супрацоўнікі замкавага комплексу «Мір» прапанавалі новы «прадукт» для турыстаў: ім прапануюць разгадаць гістарычны квэст «Вайна і Мір, або Таямніца двух куфраў». Паводле сюжэта, падчас рамонту замка яго ўладальнік князь Міхаіл Святаполк-Мірскі знайшоў старадаўні куфар, які некалі схаваў яго папярэднік — Караль Станіслаў Радзівіл падчас вайны са шведамі. Нягледзячы на ўсе намаганні, князь Міхаіл не можа адамкнуць замок, таму ён запрашае гасцей, каб яны дапамаглі яму разгадаць таямніцу.

У ходзе квэсту ўдзельнікі выконваюць шэраг заданняў і адкрываюць для сябе цікавыя гістарычныя факты. У гульні могуць адначасова ўдзельнічаць ад 10 да 80 чалавек. Мяркуецца, што квэст будуць ладзіць штотыдзень з чэрвеня да верасня.

## Шыладзюбкам падабаецца

**Тураў, Гомельская вобласць.** У пойме ракі Прыпяць загняздзіліся нетыповыя для Беларусі віды кулікоў — шыладзюбка і хадулачнік. Арнітолагі лічаць гэта ўнікальным выпадкам.

Звычайна шыладзюбкі гняздуюцца на ўзбярэжжы Балтыйскага мора і ў кар'ерах Львоўскай вобласці, а зімуюць на Міжземным моры. Раней гэтых птушак у нашай краіне назіралі толькі падчас вясновай міграцыі, але пасля было знойдзена і гняздо. Цяпер у шыладзюбак на Тураўшчыне вывеліся птушаняты.

Акрамя шыладзюбак, арнітолагі выявілі як найменш тры пары хадулачнікаў — кулікоў з надзвычай доўгімі нагамі. Апошнім разам іх бачылі ў рэгіёне ў 2013 годзе. Лічыцца, што абодва віды сталі гнездавацца на Прыпяці праз вялікі вясновы разліў.

## Вашы грошы — наша мяса

**Орша, Віцебская вобласць.** Дзве буйныя кітайскія карпарацыі плануюць рэалізаваць у Беларусі праекты агульным коштам больш за 1 млрд долараў да канца 2017 года. Адзін з іх прадугледжвае інвестыцыі ў развіццё Аршанскага мясакансервавага камбіната, якому патрэбная рэканструкцыя забойнага і каўбаснага цэхаў. Гэта звязана з тым, што кітайскі бок зацікаўлены ў імпарце беларускіх прадуктаў харчавання.

## Новы від транспарту

**Магілёў.** У абласным цэнтры распрацоўваюць праект пабудовы струннай рэйкавай дарогі. Падвесная траса можа звязаць плошчу Арджанікідзэ і раён вуліцы Маўчанская. Праектам займаецца кампанія, якая папулярызуе гэты інавацыйны від транспарту ў Беларусі. Паводле папярэдніх разлікаў, праезд у адзін канец будзе каштаваць 80 капеек, а гарадскі бюджэт зможа эканоміць 1 млн долараў на год. Даўжыня меркаванай «трасы» — 2 км 250 м, а працягласць паездкі — 2—3 хвіліны. Калі праект будзе прыняты, будаўніцтва пачнецца ў 2019 годзе.

## БЕЗГАСПАДАРЧЫХ ЗЯМЕЛЬ СТАЛА МЕНШ

### Маёмасць, якая не выкарыстоўваецца, з'яўляецца рэзервам для развіцця эканомікі рэгіёна.

**Укладзеныя ў маёмасць сродкі могуць прыносіць прыбытак не толькі асобна ўзятым суб'ектам гаспадарання, але і вобласці ў цэлым: у выглядзе падаткаў, заработнай платы і гэтак далей. Пра гэта ішла размова падчас выязной сесіі Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, прысвечанай эфектыўнасці выкарыстання на тэрыторыі Гомельскай вобласці нерухомай маёмасці.**



Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Алег Барысенка адзначыў, што работа ў гэтым кірунку, у якой задзейнічаны ўсе ўзроўні ўлады, носіць сістэмны характар. Аднак, рэзерваў яшчэ дастаткова і таму неабходна і надалей працаваць над паляпшэннем эканамічнай сітуацыі ў рэгіёне.

Дырэктар абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржмаёмасці Кацярына Зянкевіч расказала, што агульная плошча маёмасці, якая не выкарыстоўваецца ў Гомельскай вобласці, складае больш за 200 тыс. кв. м. Штогод гэты паказчык змяншаецца, але адначасова падчас аптымізацыі прадпрыемстваў з'яўляюцца новыя аб'екты. І ўсё ж у рэгіёне адбываецца зніжэнне ўдзельнай вагі плошчаў, якія не выкарыстоўваюцца. Калі чатыры гады таму гэты паказчык складаў 3,7%, то сёння ён зменшыўся да 1,4%.

Летась, падчас маштабнага абследавання раёнаў Гомельшчыны, было выяўлена больш за 5,5 тыс. такіх аб'ектаў. Праз сем месяцаў з моманту завяршэння абследавання прыцягнута ў гаспадарчы абарот або знесена каля 25% ад выяўленых дзяржаўных аб'ектаў і аб'ектаў ААТ з доляй дзяржаўнай уласнасці. Яшчэ 56% аб'ектаў плануецца задзейнічаць сёлета да канца года.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# КАБ ЖЫЦЦЁ НЕ СТАЛА ПАЛАСОЙ ПЕРАШКОД...

## Да ідэалу далёка, але дзяржава стараецца

— Фарміраванне безбар'ернага асяроддзя ў нашай краіне пачалося ў 2007 годзе, — адзначае **начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Анатоль РАЖАНЕЦ.** — Цяпер сфарміраваны цэлы комплекс тэхнічных нарматыўных прававых актаў (тэхнічныя кодэксы, дзяржаўныя стандарты, тэхрэгламенты, тэхнічныя ўмовы), які дазваляе пры праектаванні будынкаў выконваць базавыя нормы па стварэнні безбар'ернага асяроддзя. Гэтыя патрабаванні абавязковыя для ўсіх арганізацый, якія ажыццяўляюць распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі.

**У нашай краіне на сённяшні дзень налічваецца 556 109 чалавек з інваліднасцю (па стане на 01.02.2017), у тым ліку 29 931 дзіця-інвалід. Гэта амаль 6% насельніцтва.**

У Дзяржаўнай праграме аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва на 2016—2020 гады маюцца падпраграмы «Папярэджанне інваліднасці і рэабілітацыя інвалідаў», «Безбар'ернае асяроддзе жыццядзейнасці інвалідаў і фізічна асабленых асоб» і «Сацыяльная рэабілітацыя інвалідаў і пажылых грамадзян». Усе яны накіраваны на стварэнне ўмоў, якія забяспечваюць магчымасць бесперашкоднага перамяшчэння (пешшу, на транспарце, на калясцы і г. д.), доступу (у жылыя дамы, аб'екты адпачынку, медабслугоўвання і інш.) і атрымання поўнага комплексу паслуг.

*(Працяг на 5-й стар. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— І калі раней галоўным было стварэнне безбар'ернага асяроддзя, то зараз мы гаворым пра любую даступнасць — інфармацыйную, адукацыйную і іншую, — сцвярджае **член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь Таццяна СТАРЫНСКАЯ**. — Хачу сказаць, што мы даволі хутка рухаемся ў гэтым кірунку. Сёння забеспячэннем даступнасці займаецца шэраг міністэрстваў: і Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, і Міністэрства ЖКГ, і Мінінфармацыі, Мінкультуры, Мінадукацыі... І новы будынак не прымаецца, калі там не забяспечана безбар'ернае асяроддзе. Іншая справа, што ў нас праблема №1 — жыллё, якое было пабудавана раней, у першую чаргу хрушчоўкі. Там забяспечыць доступ вельмі складана. Складана прыбудаваць пандус, таму што тратуар невялікі, а вугал, які па норме не павінен перавышаць 15 градусаў — сыходзіць на праезную частку. Таму ў краіне практыкуецца перасяленне інвалідаў (вядома, па іх жаданні) на першыя паверхі. Але за ўвесь час маёй працы ў сацыяльнай службе Першамайскага раёна Віцебска (а гэта 10 гадоў) ні адзін чалавек з інваліднасцю не пагадзіўся перасяліцца на першы паверх. І я не чула пра такія выпадкі ў іншых раёнах.

> «У нас праблема №1 — жыллё, якое было пабудавана раней, у першую чаргу хрушчоўкі. Там забяспечыць доступ вельмі складана.

Як выходзяць з сітуацыі? Ёсць дамы, дзе робяць адкідныя пандусы на працягу 3—4 паверхаў, але яны небяспечныя і замінаюць іншым людзям. У Віцебску, напрыклад, фарміраваліся атрады маладых людзей, будучых спартсменаў, якія дапамагалі перамяшчацца людзям у інваліднай калясцы. Але гэта не выйсце з сітуацыі, вядома...

Другі момант, на які звяртае ўвагу Таццяна Старынская, — псіхалагічны. На сённяшні дзень грамадства псіхалагічна прыняло людзей з інваліднасцю, і гэта вялікі крок наперад. Але не ўсе гэтыя людзі самі прымаюць сябе. «Спецыялісты сацыяльных службаў адзначаюць, што інваліды-калясачнікі — самая складаная катэгорыя, — кажа Таццяна Старынская. — З імі цяжка працаваць, іх цяжка выцягнуць кудысьці. У іх шмат прэтэнзій, шмат хто з іх лічаць сябе ахвярай... Таму нам трэба псіхалагічна працаваць з імі і з іх сваякамі, блізкім асяроддзем. Абавязкова трэба больш увагі ўдзяляць асяроддзю. Калі сярод блізкіх ёсць інвалід — сям'і трэба дапамагчы адаптавацца да гэтага».

— І не трэба забываць аб прынцыпе «калі хочаш, то можаш», — упэўнена дэпутат. — Мы ў Віцебску спрабавалі выцягнуць хлопцаў — інвалідаў-калясачнікаў са сваіх кватэр: выбудавалі маршруты, як можна перасоўвацца ад аднаго значнага аб'екта да другога. Прасачылі, наколькі рэальна іх выкарыстоўваць. Нам дапамагаў у гэтым інвалід-калясачнік, які працуе ў адным з тэрытарыяльных цэнтраў сацабслугоўвання. Мы сабралі невялікую групу, і гэты чалавек паказаў маршруты і дапамог асвоіць іх. Але другі раз група ўжо не сабралася: ахвотных не было... Хоць, напрыклад, у ТЦСАН Першамайскага раёна Віцебска працуе пара — абое інваліды-калясачнікі. Яны і вандруюць, і ўдзельнічаюць у розных спаборніцтвах і канцэртах (танцуюць на калясках). Таму, калі ёсць жаданне, — усё можа атрымацца. Але гэтага павінен захацець сам чалавек.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

> «Грамадства псіхалагічна прыняло людзей з інваліднасцю, і гэта вялікі крок наперад. Але не ўсе гэтыя людзі самі прымаюць сябе.

Дзяржава ставіць перад сабой шмат задач, адзначаюць эксперты. Яна пастаянна закладвае сродкі на прыстасаванне будынкаў, адкрыццё новых працоўных месцаў для інвалідаў, іх адаптацыю да працоўнай дзейнасці. Але, вядома, да ідэалу нам яшчэ далёка. Праблема даступнага асяроддзя вельмі маштабная, паколькі інфраструктура любога горада, населенага пункта ўключае ў сябе каласальную колькасць аб'ектаў самага рознага прызначэння, архітэктурна-планіровачных і канструкцыйных асаблівасцяў, розных формаў уласнасці і ведамаснай прыналежнасці...

## Для тых, хто мае патрэбу ў даступным асяроддзі, няма дробязяў

А што кажуць аб праблеме самі людзі, якія маюць абмежаванні? «Мы прайшлі значны шлях па стварэнні нарматыўнай базы. Яна досыць добрая. Поўнае і няўхільнае выкананне ўсіх патрабаванняў у архітэктуры і будаўніцтве дазволіць закрыць пытанне», — упэўнены **дырэктар Офіса па правах людзей з інваліднасцю Сяргей ДРАЗДОЎСКІ.**

Але нядаўна, паводле яго слоў, у грамадскія арганізацыі прыйшоў для ўзгаднення новы праект Кодэкса ўстойлівых правілаў, якія выкарыстоўваюцца ў архітэктуры і будаўніцтве (па сутнасці, гэты кодэкс з'яўляецца зборнікам нормаў па даступнасці).

— У яго праекціроўшчыкі ўнеслі шэраг змяненняў, якія перакрэсліваюць практычна ўсе дасягненні апошніх гадоў і адкідаюць нас на 20 гадоў назад, — сцвярджае наш суразмоўца. — У прыватнасці, яны прапанавалі вызначыць месцы, дзе бываюць асобы з інваліднасцю. Гэта значыць, на іх думку, ёсць месцы, дзе такія людзі *могуць бываць*, і ёсць — дзе іх *быць ніяк не можа.* Але хто і як гэта будзе вызначаць? Любы забудоўшчык потым можа сказаць: тут не прадугледжваюцца такія людзі. Мы настойваем на тым, што ні ў кога няма права прымаць рашэнне, куды ісці інваліду, а куды не, акрамя яго самога.

На цяперашні момант усе грамадскія арганізацыі заявілі аб катэгарычным непрыманні гэтага праекта і прапанавалі сабрацца і абмеркаваць не гатовы праект, а яго канцэпцыю.

Другое вялікае пытанне, якое паднімаюць людзі з інваліднасцю, — гэта кантроль. Сяргей Драздоўскі сцвярджае, што ў краіне да гэтага часу ўводзяцца будынкі, якія не адпавядаюць прапісаным нормам. «Напрыклад, пабудавалі пандусы, якія кожны можа ўбачыць, паставілі ліфт — а далей пачынаюцца праблемы і цяжкасці, — тлумачыць ён. — Адсутнасць спецыяльнай прыбіральні ў офісным будынку, недаступнасць многіх месцаў... Нярэдка той, хто падняўся па пандусе, усё ж такі не ў стане папасці ў будынак: шырыня дзвярэй не адпавядае нарматывам, альбо знаходзяцца яшчэ прыступкі, падняцца па якіх чалавек ужо не можа. Таму я зараз вяду гаворку аб поўным і ўсямерным выкананні ўсіх нормаў і патрабаванняў».

## Бліжэйшым часам

Як заяўляюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, сёлета будзе распрацавана 8 дзяржаўных стандартаў у галіне безбар'ернага асяроддзя. Работы па ўладкаванні пандусаў, пашырэнні дзвярных праёмаў на ўваходзе і ўнутры будынкаў, усталёўцы поручняў, кнопак выкліку правядуць на 656 аб'ектах сацыяльнай сферы. Для забеспячэння інфармацыйнай даступнасці для асоб з парушэннямі слыху будуць адаптаваны 637 гадзін тэлевізійнага прадукту.

Прапануецца ўзмацніць адказнасць праекціроўшчыкаў і забудоўшчыкаў за невыкананне патрабаванняў па забеспячэнні безбар'ернага асяроддзя. У прыватнасці, ужо ўдасканалены парадак і ўмовы прыёму ў эксплуатацыю шматкватэрных жылых дамоў, а таксама метады кантролю якасці будаўніча-мантажных работ. Уведзены дадатковы крытэрый ацэнкі якасці аб'екта — стварэнне безбар'ернага асяроддзя. Як і норма, якая прадпісвае абавязковае правядзенне выпрабаванняў і кантрольных вымярэнняў аб'ектаў безбар'ернага асяроддзя і абавязвае забудоўшчыка і заказчыка няўхільна выконваць патрабаванні тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

Кантроль і нагляд у галіне будаўнічай дзейнасці ўскладзены на органы дзяржаўнага будаўнічага нагляду. Ставіцца задача канкрэтызаваць адказнасць за парушэнні патрабаванняў безбар'ернага асяроддзя на ўсіх этапах, каб і заказчык, і падрадчык іх няўхільна выконвалі.

Для рэалізацыі правоў інвалідаў на інклюзіўную адукацыю будуць карэктавацца планы навучання студэнтаў з інваліднасцю з улікам іх індывідуальных магчымасцяў. Установы адукацыі абсталююць неабходнымі прыстасаваннямі і тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі для інвалідаў. Плануецца развіццё дыстанцыйных формаў навучання.

Што датычыцца рэалізацыі інвалідамі права на працу, то будзе вывучана магчымасць устанаўлення квот для арганізацый па прыёме на работу інвалідаў.

Плануецца, што да 2020 года колькасць даступных аб'ектаў у прыярытэтных сферах жыццядзейнасці павялічыцца да 3624.



Фота БЕЛТА.

**Беларусь у 2015 годзе падпісала Канвенцыю аб правах інвалідаў, у 2016 годзе ратыфікавала яе. Для рэалізацыі палажэнняў канвенцыі 13 чэрвеня 2017 года быў зацверджаны Нацыянальны план — стратэгічны дакумент, скіраваны на фарміраванне ўмоў па забеспячэнні роўнасці правоў інвалідаў і стварэнні ўмоў іх максімальнай інтэграцыі. Ён прадугледжвае кансалідацыю намаганняў дзяржаўных органаў, арганізацый і інстытутаў грамадзянскай супольнасці.**

— У цэлым па краіне сітуацыя мае пазітыўнае развіццё. Вулічная дарожная інфраструктура мяняецца ў лепшы бок. Але ўсё ж з даступнасцю яшчэ шмат праблем.

> «Калі чалавек не змог скарыстацца транспартам з-за інваліднасці, то гэта дыскрымінацыя, і транспартнае прадпрыемства павінна несці адказнасць...

У маленькіх мястэчках сітуацыя, калі інвалід сядзіць у чатырох сценах, абумоўлена не тым, што ён такі лянівы, — упэўнены Сяргей Драздоўскі. — Проста куды яму выходзіць, калі ён ведае, што праз 20 метраў сутыкнецца з бардзюрам, які не зможа пераадолець? Ці калі невідушчы чалавек праз 50 метраў стукнецца аб галінку, якая не была зрэзана па патрэбных нарматывах, або натыкнецца на сметніцу, якая стаіць пасярод дарожкі... Здавалася б, дробязі. Але гэта для здаровых людзей. Для тых, хто мае патрэбу ў даступным асяроддзі, няма дробязяў. Можна пабудаваць тры кіламетры нармальнай дарогі, а потым на шляху з'явіцца бардзюр — і ўсё акажацца марным. Пакуль у нас не было ніводнага прэцэдэнту, каб мясцовыя ўлады (а яны абавязаны гэта рабіць па законе) дапамаглі ў рэканструкцыі прыватнага дома, каб зрабіць яго даступным.

— Наогул, калі з чалавекам, які пражывае дзесьці ў рэгіёне, нешта здарылася, і ён аказаўся маламабільным, у яго адразу з'ўляецца шмат праблем. Адна з галоўных — няма даступнага транспартнага забеспячэння, — тлумачыць дырэктар Офіса па правах людзей з інваліднасцю. — Каб з'ездзіць у райцэнтр, трэба заказваць машыну за свае сродкі. Мы ведаем сітуацыі, калі інваліды заказваюць машыну, каб з'ездзіць за 100 км у бальніцу і прайсці абследаванне.

Але ж чалавеку з інвалідннасцю не проста пагуляць на вуліцы трэба, яму хочацца ўключыцца ў звычайнае жыццё. А гэта значыць, атрымаць адукацыю, знайсці працу. І без даступнага транспарту мы ніяк з гэтым не справімся. Калі чалавек з інваліднасцю ўладкуецца на працу, на яе трэба кожны дзень нейк дабірацца...

> «Мы настойваем на тым, што ні ў кога няма права прымаць рашэнне, куды ісці інваліду, а куды не, акрамя яго самога.

У Мінску ўжо 70% аўтобусаў з'яўляюцца даступнымі — нізкападлогавымі. Але гэтага недастаткова. Транспарт павінен яшчэ быць абсталяваны адкіднымі платформамі. Аўтобус не можа стаць ушчыльную да тратуара, і каб інвалід-калясачнік мог патрапіць унутр, для яго павінны спусціць сходы, па якіх ён зможа заехаць. Гэтага цяпер няма. У маленькіх мястэчках сітуацыя яшчэ больш сумная. Таму мы настойваем на ўнясенні ў закон пункта аб дыскрымінацыі. Мы кажам, што калі чалавек не змог скарыстацца транспартам з-за інваліднасці, то гэта дыскрымінацыя, і транспартнае прадпрыемства павінна несці адказнасць...

Трапіць у паліклініку чалавеку з сур'ёзнай формай інваліднасці можна ў асноўным толькі на таксі. У некаторых гарадах маюцца сацыяльныя таксі. Але кожны раз выклікаць яго, калі трэба прайсці сярыю працэдур, не вельмі рэальна. Што датычыцца самой паліклінікі, то патрапіць на прыём да доктара яшчэ можна. Але возьмем, напрыклад, абавязковую для ўсіх флюараграфію: яе можна зрабіць толькі стоячы. І тут інваліду-калясачніку і медперсаналу трэба вельмі памудраваць... Калі ж флюараграфія не пройдзена, нельга атрымаць ні адной медыцынскай даведкі.

Што датычыцца даступнасці адукацыі, то, на думку Сяргея Драздоўскага, у нашай краіне ўсяго некалькі ВНУ, якія адпавядаюць крытэрыям даступнасці. Але пры гэтым яны не маюць даступнай інфраструктуры вакол сябе, не забяспечаны транспартам і г. д. Так, можна казаць аб дыстанцыйнай, завочнай адукацыі. Але ж атрыманне адукацыі — гэта яшчэ і пытанне сацыялізацыі. Для любога чалавека вельмі важныя зносіны. Таму нельга зводзіць усё да дыстанцыйных формаў навучання.

— У краіне павінен быць няўхільны кантроль за забеспячэннем даступнасці, — робіць высновы дырэктар Офіса па правах людзей з інваліднасцю. — І неабходныя дакладныя прававыя нормы. Мы не хочам, каб нас рабавалі на вуліцы — таму стварылі крымінальнае права. І калі мы не створым закона аб дыскрымінацыі інвалідаў, мы не пераадолеем яе. Праз гэта прайшлі і Еўропа, і ЗША, у якіх таксама спачатку ўсё было дрэнна ў гэтай галіне...

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

## ТАКТЫЛЬНЫЯ АБАЗНАЧЭННІ ДЛЯ НЕВІДУШЧЫХ

**Намеснік старшыні Беларускага таварыства інвалідаў па зроку Міхаіл АНТОНЕНКА:**

— Для людзей з парушэннямі зроку адным з самых актуальных з'яўляецца пытанне самастойнага прасторавага арыентавання. Сёння ў гэтым кірунку зроблена мала, хоць першыя парасткі ўжо ёсць. На некаторых вуліцах і прыпынначных пунктах ужо ўкладваецца тактыльная тратуарная плітка. Прычым гэта адбываецца не толькі ў сталіцы, але і ў рэгіёнах. Напрыклад, тактыльныя абазначэнні з'яўляюцца ў Брэсце, Гомелі, хоць да райцэнтраў пакуль такое новаўвядзенне не дайшло.

З 1 жніўня мінулага года ўступілі ў сілу два Тэхнічныя кодэксы ўсталяванай практыкі, якія апісваюць патрабаванні да камфортнага асяроддзя для невідушчых і прадугледжваюць у тым ліку стварэнне тактыльных элементаў. Адзіная праблема — гэта агаворана для новых аб'ектаў альбо для тых, якія рэканструююцца. На існуючых цяпер аб'ектах тактыльныя элементы прыйдуць невядома калі. Гэта праблема нумар адзін. Хацелася б, каб на такое важнае пытанне дзяржава паглядзела з іншага пункту гледжання.

Яшчэ адна сур'ёзная праблема — ідэнтыфікацыя грамадскіх будынкаў і збудаванняў, пунктаў прыпынку і транспартных сродкаў. Бо сляпому чалавеку складана самастойна вызначыць, дзе знаходзіцца патрэбны яму будынак альбо прыпынак, які нумар аўтобуса падышоў да прыпынку... Мы прапаноўваем на аб'ектах, якія невідушчаму трэба ідэнтыфікаваць, усталяваць інфарматары, якія актывуюцца з дапамогай пульта дыстанцыйнага кіравання, які мае інвалід па зроку. Альбо больш сучасны варыянт: можна актываваць такія інфарматары з дапамогай смартфона, да таго ж гэта танней.

Наша прапанова была адобрана і ўвайшла ў шэраг дакументаў, у тым ліку і ў Нацыянальны план дзеянняў па рэалізацыі Канвенцыі аб правах інвалідаў. Але пакуль атрымліваецца так, што ўсе згодныя, але дзеянняў ніякіх у гэтым кірунку не адбываецца. Рэгіёны тармозяць, спасылаючыся на адсутнасць сродкаў.

Яшчэ вельмі важна зрабіць даступнымі для сляпых і людзей са слабым зрокам розныя таблічкі — на ўваходзе ў памяшканне, інфармацыйныя стэнды і г. д. Для гэтага іх трэба адмысловa абазначыць. Для слабавідушчых пры гэтым выкарыстоўваецца павялічаны шрыфт і кантрасныя колеры. А для сляпых людзей трэба дубляваць інфармацыю з дапамогай шрыфту Брайля. Вельмі актуальна такое дубліраванне для паліклінік (нумары кабінетаў), для гасцініц і іншых грамадскіх будынкаў...

МЕРКАВАННІ

## «Што яшчэ трэба зрабіць для паляпшэння безбар'ернага асяроддзя?»

З такім пытаннем мы звярнуліся да людзей, якія працуюць над гэтай праблемай

**Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства глухіх» Сяргей САПУТА:**

— Па-першае, гэта даступнасць інфармацыі. Каля 20 гадоў мы ставім гэтае пытанне, але, на жаль, сёння справа прасоўваецца з вельмі вялікімі намаганнямі. Самае важнае пытанне —даступнасць тэлебачання для інвалідаў па слыху. Фільмаў з субцітрамі зусім мала, але нас пачулі «наверсе», плануюць значна павялічыць іх колькасць. Яшчэ адна праблема, якую трэба вырашаць, — гэта магчымасць адпраўкі sms-паведамленняў у экстранныя службы. Тлумачу сітуацыю: інвалід па слыху сядзіць дома, раптам яму стала дрэнна ці адбылася надзвычайная сітуацыя. Калі ён пабяжыць тлумачыць гэтую справу суседу, то далёка не кожны яго зразумее. Летась улады пайшлі нам насустрач: зараз кругласутачна працуе перакладчык мовы жэстаў, яму прыходзіць паведамленне ад глухога чалавека, пасля чаго яно перасылаецца ў патрэбную службу. Цяпер задача арганізаваць такіх памочнікаў пастаўлена і запланавана ў дзяржаўнай праграме, з гэтага года павінны ўкараніць сістэму ў абласных гарадах. У Расіі, у прыватнасці — у Маскве, гэтая сістэма працуе ўжо 7–8 гадоў. У цэлым, зараз для інвалідаў па слыху робіцца дастаткова.

**Начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай ахове Жабінкаўскага раённага выканаўчага камітэта Любоў СЕЛІВОНІК:**

— На мой погляд, сёння робіцца нямала. Напрыклад, нельга пабудаваць або рэканструяваць будынак без праекта, у якім гарантуецца арганізацыя ўмоў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. І ў нас у раёне робіцца так: заказ на пэўны праект абавязаны прадугледжваць безбар'ернае асяроддзе. Акрамя таго, мы ўвесь час кансультуемся з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі. Як мы робім, калі да нас прыходзяць такі чалавек з праблемнай сітуацыяй? Магу прывесці прыклад: дзяўчына трапіла ў аўтакатастрофу, пасля чаго яна можа перасоўвацца толькі ў інвалідный калясцы. І для таго, каб выйсці на вуліцу, неабходны з'езд. Яна да нас звярнулася, мы выехалі на месца, абследавалі, падключылі ЖКГ, пасля чаго ўсё было зроблена. У нашым невялікім раёне мы ўсім дапамагаем. Больш пытанняў, на мой погляд, у вялікіх гарадах. А калі мы не можам нешта зрабіць менавіта зараз, бо не хапае фінансаў, то плануем гэта на наступны год. Пра такія рэчы мы не забываемся.

**Праваабаронца, распрацоўшчык семінараў аб Канвенцыі па правах людзей з інваліднасцю Мікіта ТРАФІМОВІЧ:**

